Т. М. ЧАБАТАРЭЎСКАЯ, В. У. НІКАЛАЕВА

МАТЭМАТЫКА

4

Частка 2

Складанне мнагазначных лікаў

	Дзяс. тыс.	Тыс.	Сот.	Дзяс.	Адз.
+	7	1	3	2	5
	1	5	4	6	1
	8	6	7	8	6

$$\begin{array}{r} 71325 \\ +\ 15461 \\ \hline 86786 \end{array}$$

	Сот. тыс.	Дзяс. тыс.	Тыс.	Сот.	Дзяс.	Адз.
+	1	6	5	7	0	8
			9	8	7	6
	1	6	14	15	7	14
	1	7	5	5	8	4

$$\begin{array}{r} 165708 \\ +\ \ 9876 \\ \hline 175584 \end{array}$$

Адніманне мнагазначных лікаў

	Дзяс. тыс.	Тыс.	Сот.	Дзяс.	Адз.
–	8	2	3	1	7
	5	0	1	0	3
	3	2	2	1	4

$$\begin{array}{r} 82317 \\ -\ 50103 \\ \hline 32214 \end{array}$$

	Дзяс. тыс.	Тыс.	Сот.	Дзяс.	Адз.
	3	3	1	0	1
	3	3	0	10	1
	3	3	0	9	11
–	3	2	10	9	11
		2	2	4	8
	3	0	8	5	3

$$\begin{array}{r} 33101 \\ -\ \ 2248 \\ \hline 30853 \end{array}$$

Т. М. Чабатарэўская, В. У. Нікалаева

МАТЭМАТЫКА

Вучэбны дапаможнік для 4 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках

Частка 2

Дапушчана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

2-е выданне,
выпраўленае і дапоўненае

Мінск
«Пачатковая школа»
2018

Правообладатель Пачатковая школа

УДК 51(075.2=161.3)
ББК 22.1я71
Ч-12

Рэцэнзент:

дацэнт кафедры прафесійнага навучання і педагогікі
Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт *Т. М. Канашэвіч*

Умоўныя абазначэнні:

— новая тэма

5*. — творчае заданне

— параўнай

9. — дамашняе заданне

Чабатарэўская, Т. М.

Ч-12 Матэматыка : вучэб. дапам. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 2 / Т. М. Чабатарэўская, В. У. Нікалаева. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мінск : Пачатковая школа, 2018. — 144 с. : іл.

ISBN 978-985-565-566-5.

УДК 51(075.2=161.3)
ББК 22.1я71

ISBN 978-985-565-566-5 (ч. 2)
ISBN 978-985-565-474-3

© Чабатарэўская Т. М., Нікалаева В. У., 2014
© Чабатарэўская Т. М., Нікалаева В. У., 2018, са змяненнямі
© Афармленне. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Пачатковая школа”», 2018

Правообладатель Пачатковая школа

ЗМЕСТ

Множанне і дзяленне..... 4

Паўтарэнне вывучанага ў IV класе..... 122

Вучыся разважаць правільна 139

Правообладатель Пачатковая школа

МНОЖАННЕ І ДЗЯЛЕННЕ

Урок 68

$312 \cdot \mathbf{10} = 312\mathbf{0}$

$312 \cdot \mathbf{100} = 312 \cdot (10 \cdot 10) = (312 \cdot 10) \cdot 10 =$
$= 31\,2\mathbf{00}$

$312 \cdot \mathbf{1000} = 312 \cdot (100 \cdot 10) = (312 \cdot 100) \cdot 10 =$
$= 312\,\mathbf{000}$

Каб памножыць лік на разрадную адзінку (10, 100, 1000 і г. д.), трэба справа прыпісаць да яго столькі нулёў, колькі іх у дадзенай разраднай адзінцы.

1. Вылічы.

2546 · 100	1056 · 100	100 · 8324
397 · 1000	67 · 10 000	1000 · 36

2. У якім ліку ўсяго 9312 дзясяткаў? 237 сотняў? 435 тысяч?

3. Запоўні пропускі.

4 ц 4 кг = ☐ кг	4 км 4 дм = ☐ см
4 г 4 мін = ☐ мін	6 т 6 кг = ☐ кг
6 м 60 мм = ☐ см	6 мін 6 с = ☐ с

4. Маса машыны, нагружанай цэглай, — 5 т 8 ц 70 кг. Пасля разгрузкі яе маса стала 3 т 170 кг. Колькі штук цэглы везла машына, калі маса адной цагліны 5 кг?



Правообладатель Пачатковая школа

5*. Памяншаемае большае за аднімаемае на 3, а аднімаемае большае за рознасць на 3. Знайдзі памяншаемае, аднімаемае і рознасць.

6. Параўнай лікі: 18, 180, 1800, 18 000. У колькі разоў павялічыцца лік, калі ў яго запісе справа прыпісаць адзін нуль? Два нулі? Тры нулі?

7. Павяліч лікі 44, 50, 25, 300, 450 у 10 разоў; у 100 разоў; у 1000 разоў.

8. Выразі ў квадратных сантыметрах.

60 дм^2 25 дм^2 39 дм^2 7 дм^2 20 см^2

9. Параўнай без вылічэнняў.

43 · 87 * 44 · 87 345 · 287 * 387 · 345
100 · 100 * 99 · 100 985 · 358 * 985 · 957

10. Калі турысты прайшлі 7 км 800 м, ім засталося прайсці на 2 км 400 м больш, чым яны прайшлі. Знайдзі адлегласць, якую павінны прайсці турысты.



11. Вылічы.

(246 − 70) · 100 (900 − 405) · 100
(709 − 500) · 1000 (800 − 778) · 1000
(390 + 60) · 100 (217 + 183) · 100

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 69

Задача. Гаспадыня расфасавала 20 кг цыбулі і 15 кг морквы пароўну ў 7 пакетаў. Колькі атрымалася пакетаў з цыбуляй і колькі з морквай?

	Маса ў адным пакеце	Колькасць пакетаў	Агульная маса
цыбуля	аднолькавая	? } 7	20 кг
морква		?	15 кг

1. Параўнай велічыні.

25 дм * 2525 мм
40 ц 25 кг * 4 ц
2 ц 71 кг * 2070 кг
6 т 49 кг * 74 ц
8 м 6 дм * 860 см
5 км 35 м * 5350 м

2. Адкажы на пытанні.

а) Адно складаемае паменшылі на 17 адзінак. Як трэба змяніць другое складаемае, каб сума не змянілася?

б) Адно складаемае павялічылі на 20 адзінак. Як трэба змяніць другое складаемае, каб сума паменшылася на 10 адзінак?

в) Адно складаемае паменшылі на 32 адзінкі. Як трэба змяніць другое складаемае, каб сума павялічылася на 28 адзінак?

3*. Што большае і на колькі: сума ўсіх адназначных лікаў, якія не дзеляцца на 2, ці сума ўсіх адназначных лікаў, якія дзеляцца на 2?

Правообладатель Пачатковая школа

4. Начарці два розныя прамавугольнікі так, каб плошча кожнага была роўная 18 см^2.

5. Рашы ўраўненні.

$x : 2 = 240 + 250$ $\qquad$ $92\,578 - x = 7541 + 54\,000$

$a \cdot 5 = 254 + 256$ $\qquad$ $4587 + y = 8432 - 2841$

6. З участка памерамі 3 га сабралі 900 кг бульбы. Якая ўраджайнасць бульбы на гэтым участку?

7. Памнож на 10: 345; 2000; 4 м 30 см.

Памнож на 100: 403; 340; 41 г; 130 кг.

8. Адлегласць паміж Полацкам і Гомелем 430 км. Адначасова насустрач адна адной з гэтых гарадоў выехалі дзве машыны са скарасцямі 45 км/г і 55 км/г. Запішы выразы для знаходжання адлегласці паміж машынамі праз t гадзін.

9. Два аўтобусы рухаліся з аднолькавай скорасцю. Першы быў у дарозе 5 г, гэта на 3 г больш, чым знаходзіўся ў дарозе другі аўтобус. Якую адлегласць праехаў другі аўтобус, калі першы праехаў 300 км?

Скорасць	Час	Адлегласць
аднолькавая	5 г ?, на 3 г менш	300 км ?

10. Вылічы.

5 г 37 мін + 1 г 38 мін $\qquad$ 8 кг 325 г – 5 кг 500 г

7 км 204 м – 2 км 800 м $\qquad$ 3 сут 21 г + 47 г

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 70

1. Для ўпрыгожвання ёлкі купілі 14 скрынак з малымі і вялікімі шарамі. Усяго аказалася 32 малыя і 24 вялікія шары. Колькі было скрынак з вялікімі і малымі шарамі, калі шароў рознага віду ў скрынках было пароўну?

	У адной скрынцы	**Колькасць скрынак**	**Усяго шароў**
малых шароў	аднолькава	?	32
вялікіх шароў		?	24
		14	

2. Вылічы.

(800 – 650 : 5) · 10 832 : 8 + 3 · 304

760 : 4 + (230 · 4 + 450 · 3) 75 · 100 – 609 : 3

3. Даўжыня прамавугольніка роўная старане квадрата з перыметрам 48 см, а яго шырыня ў 4 разы меншая. Чаму роўныя плошча прамавугольніка і плошча квадрата?

4.

9000 кг * 9 т 5 кг 390 г * 5 кг 93 г

250 кг * 3 ц 325 890 г * 30 кг

Правообладатель Пачатковая школа

5*. Лесвіца мае 17 прыступак. Саша лічыць прыступкі зверху, а Дзіма — знізу. Яны сышліся на прыступцы, якую Саша назваў сёмай. Якой па ліку назаве гэту прыступку Дзіма?

6. Правядзі дзве прамыя. Адзнач 7 пунктаў так, каб на адной прамой іх было 3, а на другой — 5.

7. Вылічы.

6 г 48 мін + 15 г 39 мін	85 м 18 см + 9 м 84 см
13 г 37 мін – 6 г 48 мін	152 дм 5 см – 1008 см
11 ц 8 кг + 8 ц 98 кг	6 кг 150 г – 2 кг 750 г

8. Начарці прамы вугал ABC і падзялі яго промнем BK на дзве часткі. Вызнач від утвораных вуглоў.

9. Адлегласць паміж гарадамі 540 км. Колькі часу спатрэбіцца машыне на праезд туды і назад, калі туды яна будзе ехаць са скорасцю 60 км/г, а назад на 30 км/г хутчэй?

10. Упішы лікі ў «акенцы» так, каб атрымаліся правільныя роўнасці.

□ : 7 = 15 (аст. 1) 85 : □ = 9 (аст. 4)

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 71

2432 · 2 = □

2432 · 2 = (2000 + 400 + 30 + 2) · 2 =
= 2000 · 2 + 400 · 2 + 30 · 2 + 2 · 2 =
= 4000 + 800 + 60 + 4 = 4864

	Тыс.	Сот.	Дзяс.	Адз.
×	2	4	3	2
				2
	4	8	6	4

$$\begin{array}{r} 2432 \\ \times\quad 2 \\ \hline 4864 \end{array}$$

Пішу другі множнік пад адзінкамі першага.

1. **Множу адзінкі:** 2 адз. · 2 = 4 адз.
   Пішу 4 пад адзінкамі.
2. **Множу дзясяткі:** 3 дзяс. · 2 = 6 дзяс.
   Пішу 6 пад дзясяткамі.
3. **Множу сотні:** 4 сот. · 2 = 8 сот.
   Пішу 8 пад сотнямі.
4. **Множу тысячы:** 2 тыс. · 2 = 4 тыс.
   Пішу 4 пад тысячамі.

1. Вылічы.

$$\begin{array}{r} 2412 \\ \times\quad 2 \\ \hline \end{array} \qquad \begin{array}{r} 4122 \\ \times\quad 3 \\ \hline \end{array} \qquad \begin{array}{r} 1033 \\ \times\quad 3 \\ \hline \end{array} \qquad \begin{array}{r} 2312 \\ \times\quad 3 \\ \hline \end{array}$$

2. 225 кг яблыкаў расклалі ў скрыні пароўну. У 7 скрынь расклалі 105 кг яблыкаў. Колькі спатрэбіцца такіх скрынь, каб раскласці астатнія яблыкі?

Правообладатель Пачатковая школа

3. Выразі:

а) у месяцах — 6 гадоў; 8 гадоў; 10 гадоў;
б) у гадзінах — 6 сут; 240 мін; 280 мін; 540 мін;
в) у мінутах — 120 с; 360 с; 12 г;
г) у секундах — 3 мін; 7 мін; 5 г; 4 г.

4*. Запішы лік 26, выкарыстаўшы пяць разоў лічбу 2, знакі арыфметычных дзеянняў і дужкі.

5. Выканай дзеянні.

20 м 27 см − 11 м 90 см
2 г 30 мін + 18 г 27 мін
15 кг 750 г − 13 кг 900 г
20 т 754 кг − 18 т 800 кг

6. Знайдзі агульную частку трохвугольнікаў ABC і DEF.





7. У краме за адзін дзень прадалі 2332 пакеты вяршкоў, кефіру — у 3 разы больш, чым вяршкоў, а малака столькі, колькі вяршкоў і кефіру разам. Колькі пакетаў малочнай прадукцыі прадалі ў краме за дзень?

8. Вылічы.

$$\begin{array}{r} 1221 \\ \times\ \ 4 \\ \hline \end{array} \qquad \begin{array}{r} 3322 \\ \times\ \ 3 \\ \hline \end{array} \qquad \begin{array}{r} 3124 \\ \times\ \ 2 \\ \hline \end{array} \qquad \begin{array}{r} 4341 \\ \times\ \ 2 \\ \hline \end{array}$$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 72

×

Тыс.	Сот.	Дзяс.	Адз.
1	2	8	5
			3
3	6	24	15
3	8	5	5

$$\begin{array}{r} {\scriptstyle 21} \\ 1285 \\ \times\quad 3 \\ \hline 3855 \end{array}$$

1. **Множу адзінкі:** 5 адз. · 3 = 15 адз.
   15 адзінак — гэта 5 адзінак і 1 дзясятак.
   Пішу 5 пад адзінкамі, а 1 дзясятак запамінаю.
2. **Множу дзясяткі:** 8 дзяс. · 3 = 24 дзяс.
   24 дзяс. + 1 дзяс. = 25 дзяс.
   25 дзясяткаў — гэта 5 дзясяткаў і 2 сотні.
   Пішу 5 пад дзясяткамі, а 2 сотні запамінаю.
3. **Множу сотні:** 2 сот. · 3 = 6 сот.
   6 сот. + 2 сот. = 8 сот.
   Пішу 8 пад сотнямі.
4. **Множу тысячы:** 1 тыс. · 3 = 3 тыс.
   Пішу 3 пад тысячамі.

1. Вылічы.

$$\begin{array}{r} 2542 \\ \times\quad 2 \\ \hline \end{array} \qquad \begin{array}{r} 12364 \\ \times\quad 4 \\ \hline \end{array} \qquad \begin{array}{r} 2346 \\ \times\quad 6 \\ \hline \end{array} \qquad \begin{array}{r} 4521 \\ \times\quad 5 \\ \hline \end{array}$$

2. За два дні швачка пашыла 14 аднолькавых фартухоў. У першы дзень яна выкарыстала 16 м тканіны, а ў другі — 12 м тканіны. Колькі фартухоў шыла швачка кожны дзень?

Правообладатель Пачатковая школа

3. Рашы ўраўненні.

$x \cdot 8 = 320$	$k : 2 = 86$	$m : 10 = 70$
$7 \cdot x = 560$	$450 : a = 5$	$430 : b = 43$

4. Бярозавы гай займае 5 га. Колькі квадратных метраў займае бярозавы гай?

5. Складзі па схеме задачу і рашы яе.



6*. Вова кажа: «Я праязджаю на сваім веласіпедзе 24 км за 2 г». А Саша сцвярджае: «Я праеду 4 км за 15 мін». Хто з хлопчыкаў хутчэй ездзіць на веласіпедзе?

7. Вылічы зручным спосабам.

1800 г + 7500 г + 7200 г + 2500 г
1500 кг + 7700 кг + 3500 кг + 2300 кг
37 см + 55 см + 63 см + 45 см + 80 см

8. Даярка за дзень падаіла 17 кароў. 9 кароў далі па 18 л малака, а астатнія — 17 л кожная. Які дзённы надой малака?

9. Вылічы.

434 268 · 2	312 286 · 3	1138 · 7
15 634 · 4	1146 · 6	121 244 · 0
22 155 · 4	134 156 · 1	97 304 · 5

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 73

130 · 5 = 13 дзяс. · 5 = 65 дзяс. = 650

Сот.	Дзяс.	Адз.
1	3	0
	5	
6	5	0

$$\begin{array}{r} 130 \\ \times\ \ 5 \\ \hline 650 \end{array}$$

700 · 4 = 7 сот. · 4 = 28 сот. = 2800

Тыс.	Сот.	Дзяс.	Адз.
	7	0	0
	4		
2	8	0	0

$$\begin{array}{r} 700 \\ \times\ \ 4 \\ \hline 2800 \end{array}$$

1. Вылічы.

160 · 3	700 · 8	13 000 · 6	16 000 · 7
640 · 2	900 · 6	19 000 · 4	18 000 · 9

2. У лесапарку пасадзілі 250 дрэў. Бярозы складаюць $\frac{1}{5}$ усіх дрэў, хвоі — $\frac{1}{4}$ астачы, а астатнія дрэвы — елкі. Колькі дрэў кожнага віду пасадзілі ў лесапарку?

3. Вылічы.

6 сут 6 г : 3 + 3 сут 18 г – 2 сут 7 г

3 сут 15 г : 3 + 6 сут 18 г : 6 – 1 сут 21 г

Правообладатель Пачатковая школа

4*. Пасажыр, праехаўшы палову шляху, заснуў. Калі ён прачнуўся, яму засталося ехаць яшчэ палову таго, што ён праехаў, калі спаў. Колькі кіламетраў шляху праспаў пасажыр, калі ўсяго яму трэба было праехаць 600 км?



5. Знайдзі значэнне выразу $2700 \cdot b + b$, калі $b = 4$; 7; 1; 0.

6. Рашы ўраўненні.

$x + 112 = 700$ $\quad$ $x - 19 = 39$

$x - 141 = 103$ $\quad$ $93 + x = 235$

7. Двор мае форму квадрата, старана якога 20 м. Забудовы займаюць чацвёртую частку ўсяго двара. Якая плошча двара свабодная ад забудоў?



8. З аднаго горада ў процілеглых напрамках адначасова выехалі два аўтамабілі. Адзін ехаў са скорасцю 52 км/г, а другі — са скорасцю 74 км/г. На якой адлегласці адзін ад аднаго будуць аўтамабілі праз 8 г?



9. Вылічы.

$350 \cdot 7$	$8400 \cdot 6$	$74\,300 \cdot 8$	$87\,000 \cdot 7$
$730 \cdot 8$	$6900 \cdot 5$	$28\,100 \cdot 5$	$50\,900 \cdot 8$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 74

3 т 225 кг · 3 = □

3 т 225 кг = 3225 кг

$$\begin{array}{r} 3225 \\ \times \quad 3 \\ \hline 9675 \end{array}$$

9675 кг = 9 т 675 кг

3 г 18 мін · 7 = □

3 г · 7 = 21 г

18 мін · 7 = 126 мін

126 мін = 2 г 6 мін

21 г + 2 г 6 мін =

= 23 г 6 мін

1. Вылічы.

15 км 320 м · 3

7 т 25 кг · 4

5 ц 85 кг · 5

1 г 20 мін · 7

18 дм 7 см · 9

5 дм 6 мм · 8

2. З аднаго кавалка плашчовай тканіны пашылі 19 аднолькавых курток, а з другога — 17 такіх самых курток. Усяго на гэтыя курткі зрасходавалі 72 м тканіны. Колькі метраў тканіны было ў кожным кавалку?

3. Складзі па схемах ураўненні і рашы іх.



4. Колькі квадратных метраў складае: 7 га; 20 га? Колькі квадратных дэцыметраў складае: 7 м²; 6 м² 3 дм²; 100 м²?

Правообладатель Пачатковая школа

5*. Паўсотні яблыкаў расклалі ў адзін вялікі і два малыя кошыкі. У вялікі кошык паклалі на 8 яблыкаў больш, чым у кожны малы кошык. Колькі яблыкаў у кожным кошыку?

6. Якія лічбы заменены зорачкамі?

7*57 < 7864	542* < 5429
25*6 < 2542	4*8 < 469

7. Начарці трохвугольнік з прамым вуглом, дзве стараны якога роўныя 2 см 6 мм.

8. Якую частку складае: 20 кг ад 1 ц; 100 кг ад 1 т; 10 см ад 1 м; 100 м ад 1 км; 500 г ад 1 кг?

9. У колькі разоў паменшыцца плошча квадрата, калі яго старану паменшыць у 2 разы? У 3 разы?

10. Са 100 кг буракоў атрымліваецца 7 кг цукру. Колькі кілаграмаў цукру можна атрымаць з 3 т буракоў?

11. Вылічы.

4 дм 6 см · 3	4 м 16 см · 3	8 ц 75 кг · 4
1 дм 2 мм · 6	2 м 4 см · 6	9 ц 52 кг · 4

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 75

1. У адным кавалку тканіны было 69 м, а ў другім — 75 м. З гэтай тканіны пашылі касцюмы, расходуючы 3 м на кожны касцюм. Колькі касцюмаў атрымалася?

На адзін касцюм	Колькасць касцюмаў	Агульны расход
3 м	? } ? ?	69 м
		75 м

2. Вылічы.

3423 · 3	5421 · 3	83 624 · 6
20 412 · 2	8739 · 2	71 521 · 3

3. Перыметр прамавугольніка 1 дм 6 см. Даўжыня адной яго стараны 5 см. Знайдзі плошчу гэтага прамавугольніка.

4. Запоўні пропускі, ведаючы, што пры дзяленні атрымліваецца найбольшая з магчымых астач.

□ : 9 = 397 (аст. □)

□ : 8 = 1909 (аст. □)

5. Знайдзі невядомы множнік.

152 · □ = 15 200	710 · □ = 710 000
6200 · □ = 620 000	54 · □ = 54 000

Правообладатель Пачатковая школа

6. Вылічы.

5 т 800 кг – 4 т 900 кг	7 м 25 см – 6 м 40 см
3 г 12 мін – 1 г 40 мін	9 т 350 кг – 4 т 820 кг

7*. У бочцы 100 л бензіну. Ёсць дзве пустыя ёмістасці: адна на 30 л, а другая на 70 л. Як адмераць 10 л бензіну? 50 л бензіну?



8. Растлумач з дапамогай схемы, што абазначаюць выразы.

55 · 4 60 · 4 60 · 4 – 55 · 4 60 – 55



9. Зараз 8 г раніцы. Якая гадзіна сутак надыдзе праз 12 г? Праз 16 г? Праз 24 г?

10. Паміж вучнямі двух класаў падзялілі пароўну 200 падручнікаў. У адным класе 24 вучні, а ў другім — 26 вучняў. Колькі падручнікаў атрымаў кожны клас?

11. Вылічы.

360 : 4 + 240 : 4	600 : 15 + 150 : 15
(34 + 166) · 2	(225 + 75) · 8
85 · 8 – 85 · 6	810 : 9 – 630 : 9

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 76

1. Дзве групы турыстаў за абедам занялі ў кафэ 120 месцаў. Першая група заняла 14 столікаў, а другая — 16 такіх самых столікаў. Колькі чалавек было ў кожнай групе?

Месцаў за адным столікам	Колькасць столікаў	Усяго месцаў
аднолькава	14	? } 120
	16	?

2. Складзі выраз і знайдзі яго значэнне:

а) да паловы сумы лікаў 214 і 740 дадай падвоеную рознасць лікаў 66 504 і 50 609;

б) да паловы рознасці лікаў 94 000 і 246 дадай падвоеную суму лікаў 1208 і 2394.

3. Начарці прамы, тупы і востры вуглы з агульнай вяршыняй O. Адзнач іх. Колькі прамянёў выходзіць з пункта O?

4*. У гасцініцы 24 пакоі. Некалькі пакояў на 2 чалавекі, а астатнія — на аднаго. Колькі двухмесных і колькі аднамесных пакояў у гасцініцы, калі адначасова ў ёй можна размясціць 40 чалавек?

5.

303 см * 3 м 3 см	35 т * 25 000 кг
8 дм 8 см * 808 см	240 мін * 6 г
526 кг * 6 ц	2 сут * 48 г

Правообладатель Пачатковая школа

6. Назаві ўсе трохзначныя лікі, сума лічбаў якіх роўная 1; 2; 3.

7. Начарці прамавугольнік, даўжыня якога роўная $\frac{1}{4}$ ад 32 см, а шырыня — палове даўжыні. Вылічы перыметр і плошчу гэтага прамавугольніка.

8. Складзі выразы па схемах і знайдзі іх значэнні.



9. Вылічы.

(6720 · 4 + 920 : 4) – 110
(249 281 – 6281) + (10 000 – 3521)
(72 540 – 1295) : 5 + 6302 · 7

10. Кожны вечар на праспекце ўключаецца 150 ліхтароў. Пры збоі ў энергазабеспячэнні патухла $\frac{1}{10}$ усіх ліхтароў. На рамонт аднаго ліхтара аднаму электрыку патрэбна 10 мінут. Праз які час брыгада з пяці электрыкаў выправіць непаладкі?

11. Рашы ўраўненні.

$195 = 228 - 17 + 25 - x$
$x \cdot 9 = 87\,000 - 86\,919$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 77

дзель

a : b = c

дзялімае — дзельнік — дзель

$a : b = c$ $\quad a = c \cdot b$ $\quad b = a : c$

Дзяленне — дзеянне, адваротнае множанню.

Падзяліць лік a на лік b — азначае знайсці такі лік c, які пры множанні на лік b дае лік a.



1. Складзі выразы для рашэння задач.

а) У школьнай кіназале сядзяць a дзяцей па 8 чалавек у радзе. Колькі ўсяго радоў у школьнай кіназале?

б) Доктар прапісаў хвораму 36 таблетак на c дзён. Колькі таблетак штодзённа павінен прымаць хворы?

в) Для заняткаў фізкультурай усіх вучняў класа размеркавалі на m груп па k чалавек. Колькі чалавек у класе?

2. Вылічы.

560 − 120 · 4 + 19	580 : 2 − 107
480 : 6 + 260 · 2	460 + 3 · 120
812 : 4 + 300 : 10	960 : 6 + 270

3. Правер дзяленне.

372 : 3 = 124 $\quad$ 924 : 4 = 231 $\quad$ 464 : 4 = 116

Правообладатель Пачатковая школа

4. Маторная лодка са скорасцю 24 км/г прайшла адлегласць 72 км супраць цячэння ракі, а на адваротны шлях яна затраціла на 1 г менш. З якой скорасцю рухалася лодка па цячэнні ракі?



5*. На матэматычнай алімпіядзе Таня, Іра і Лена занялі тры прызавыя месцы. Вядома, што месца Іры не другое, Таня заняла не першае месца, а месца Лены вышэйшае, чым у Іры. Як размеркаваліся прызавыя месцы паміж дзяўчынкамі?



6. Вылічы.

25 т + 35 ц	1 г 20 мін − 45 мін
27 ц 42 кг + 58 кг	2 г 45 мін + 85 мін
37 ц − 5 ц 39 кг	23 мін · 7

7. Начарці прамавугольнік з плошчай 20 см^2 і прамавугольнік, плошча якога ў 2 разы меншая.

8. Турысты за два дні прайшлі 44 км, рухаючыся з аднолькавай скорасцю. Першы дзень яны былі ў дарозе 6 г, а другі дзень — 5 г. Якую адлегласць прайшлі турысты за першы дзень?

9. Вылічы.

75 : 5	126 : 6	900 : 9 + 200 · 3
81 : 3	243 : 3	6 · 100 − 700 : 7

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 78

Успомні!

$a : 1 = a$
$a : a = 1$
$0 : a = 0$

~~$a : 0$~~
На нуль дзяліць нельга.

1. Вылічы.

$0 \cdot 15$	$0 : 15$	$15 : 1$	$15 \cdot 1$	$15 : 15$
$1 \cdot 15$	$15 \cdot 0$	$15 - 0$	$15 + 0$	$15 - 15$

2. З кавалка тканіны пашылі 24 дзіцячыя сукенкі з расходам 1 м на кожную. Колькі сукенак для дарослых з расходам 4 м на кожную магло б атрымацца з гэтага ж кавалка тканіны?

3. Вылічы.
$860 : 5 + (632 \cdot 4 + 454 \cdot 3)$
$480 : 2 + (6380 - 4169)$
$1203 \cdot 4 + (7009 - 3540)$

4. Начарці прамавугольнік, адна старана якога 8 см, а другая 2 см. Вылічы плошчу і перыметр гэтага прамавугольніка. Начарці квадрат з такой жа плошчай і квадрат з такім жа перыметрам.

5*. Старана квадрата 30 см. З адной вяршыні ў розных напрамках па перыметры квадрата пачалі рухацца дзве мурашкі. Адна паўзе са скорасцю 1 см/с, а другая — у 2 разы хутчэй. Якая адлегласць па перыметры будзе паміж імі праз 25 с?



Правообладатель Пачатковая школа

6. Складзі ўраўненне і рашы яго:

а) калі невядомы лік павялічыць у 8 разоў, то атрымаецца 64;

б) калі невядомы лік паменшыць у 8 разоў, то атрымаецца 64;

в) калі невядомы лік паменшыць на 8, то атрымаецца 64;

г) калі невядомы лік паменшыць на 64, то атрымаецца 8.

7. Пастаў замест a і b такія лікі, каб роўнасці былі правільныя.

$a : 1 = 1 : a$ $\qquad$ $a : b = b : a$

$0 : a = 0 \cdot a$ $\qquad$ $b : 1 = 0 \cdot b$

8. Параўнай без вылічэнняў.

$156 : 12 * 156 : 13$ $\qquad$ $924 : 11 * 924 : 12$

$720 : 9 * 720 : 8$ $\qquad$ $600 : 24 * 600 : 25$

9. Аўтамабіль «Ніва» за 3 г можа праехаць 360 км. Страус можа бегчы са скорасцю 60 км/г. Параўнай скорасці аўтамабіля «Ніва» і страуса.

?

60 км/г

10. Вылічы.

$9010 - 368 \cdot 8$ $\qquad$ $1000 - 8 \cdot 25$

$800 : 4 + 20 \cdot 10$ $\qquad$ $2050 - 45 \cdot 8$

$803 - 600 : 6$ $\qquad$ $4400 + 280 : 8$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 79

Успомні!

Каб падзяліць лік на здабытак, можна гэты лік падзяліць на адзін множнік, а атрыманы вынік падзяліць на другі множнік.

$$a : (b \cdot c) = (a : b) : c = (a : c) : b$$

1. Вылічы рознымі спосабамі.

$12 : (3 \cdot 2)$	$90 : (5 \cdot 2)$	$64 : 16$	$40 : (4 \cdot 10)$
$32 : (2 \cdot 4)$	$84 : (2 \cdot 6)$	$72 : 24$	$720 : (8 \cdot 3)$

2. У першай палове дня ў цяпліцы сабралі 360 кг памідораў і расклалі іх у скрыні па 9 кг у кожную. У другой палове дня сабралі яшчэ столькі ж памідораў. $\frac{1}{10}$ іх расклалі ў такія ж скрыні. Колькі скрынь атрымалася за ўвесь дзень?



9 кг

3. Параўнай без вылічэнняў.

$360 : 30 * 360 : 10 : 3$	$360 : (3 \cdot 10) * 360 \cdot 3 \cdot 10$
$360 : 30 * 360 : 10 \cdot 3$	$360 : (3 \cdot 10) * 360 : 3 : 10$

4. Знайдзі даўжыню адрэзка BK, ведаючы, што перыметр прамавугольніка $ABCD$ 18 см, старана CD 3 см, старана KC 4 см.



Правообладатель Пачатковая школа

5. Рашы ўраўненні.

$k : 3 = 3192$ $\qquad$ $42 : x = 14$ $\qquad$ $a : 2 = 4878$

6. Плошча прамавугольніка ў 2 разы меншая, чым плошча квадрата са стараной 6 см. Знайдзі шырыню гэтага прамавугольніка, калі яго даўжыня 9 см.

7. Выканай дзяленне з астачай. Зрабі праверку.

34 : 7	69 : 8	57 : 9	94 : 30	61 : 14
84 : 9	30 : 7	95 : 6	4 : 9	1 : 7
98 : 8	47 : 5	58 : 5	58 : 9	99 : 10
87 : 7	79 : 6	89 : 9	91 : 7	83 : 8

8*. У двух альбомах аднолькавая колькасць марак. З першага альбома ў другі пераклалі 16 марак. На колькі марак у першым альбоме стала менш, чым у другім?



9.

8000 кг * 8 т	12 г * 800 мін
5 т 620 кг * 5620 кг	3 сут * 100 г
240 кг * 2 ц	2 сут 5 г * 57 г
7 ц 54 кг * 745 кг	72 000 мін * 1 сут
4780 г * 5 кг	5 сут * 120 г

10. У валейбол гулялі 14 дзяўчынак і 6 хлопчыкаў. Яны раздзяліліся пароўну на дзве каманды. Колькі чалавек у кожнай камандзе?

11. Вылічы.

$2408 \cdot 7 - 14\,000$	$13\,200 - 348 \cdot 6$
$7445 + 930 : 3$	$780 : 4 + 3256$
$270 : (3 \cdot 9)$	$450 : (18 \cdot 5)$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 80

Задача. Два класы спаборнічалі ў зборы яблыкаў. Першы сабраў 40 вёдраў яблыкаў, а другі — 43 такія ж вядры. Другі клас сабраў на 27 кг яблыкаў больш, чым першы. Колькі кілаграмаў яблыкаў сабраў кожны клас?

	Маса ў адным вядры	Колькасць вёдраў	Агульная маса
I	аднолькавая	40	?
II		43	?, на 27 кг больш

1. Вылічы.

1402 · 8	400 : (5 · 16)	4729 · 5	88 : (11 · 4)
3039 · 3	360 : (4 · 9)	2084 · 7	900 : (10 · 5)

2.

3030 см * 30 м 30 см	2 сут * 80 г
70 дм 7 см * 770 см	3 т * 300 кг
3 км 20 м * 3 км 2 дм	1 м^2 * 1000 дм^2
20 ц 30 кг * 23 ц	5 а * 500 м^2

3. З лікаў 53 761, 6401, 10 740, 89 623, 7524, 2342 выпішы:

а) пяцізначныя лікі, у запісе якіх выкарыстоўваюцца розныя лічбы;

б) чатырохзначныя лікі, якія не маюць лічбы 5 у разрадзе сотняў.

Правообладатель Пачатковая школа

4. Косця пайшоў на трэніроўку ў 8 г 20 мін, а вярнуўся ў 10 г 42 мін. Колькі часу Косця адсутнічаў дома?

5*. Знайдзі заканамернасць і прадоўжы рад: 4, 5, 8, 9, 12, 13, $\square$, $\square$.

6. Рашы ўраўненні.

$x + 749 = 10\,000$ $\quad$ $456 + x = 1004$

$2082 - x = 1536$ $\quad$ $x - 1028 = 472$

7. Вова сказаў, што адзін адрэзак у 2 разы большы за другі. Каця пра тыя ж адрэзкі сказала, што адзін з іх на 3 см даўжэйшы за другі. Што гэта за адрэзкі? Начарці іх.

8. Якія лічбы заменены зорачкамі?

$$\begin{array}{r} 8138 \\ \times\quad * \\ \hline 16*** \end{array} \qquad \begin{array}{r} 8** \\ \times\quad 9 \\ \hline *389 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 1854 \\ \times\quad * \\ \hline **70 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 5**4 \\ \times\quad 7 \\ \hline 36778 \end{array}$$

9. У спартыўны магазін прывезлі клюшкі, шайбы і канькі. Клюшак было 96 штук, што ў 3 разы менш, чым шайбаў. Канькоў было ў 2 разы менш, чым шайбаў. Колькі канькоў прывезлі ў спартыўны магазін?

10. Вылічы.

$1754 \cdot 3$	$7002 \cdot 8$	$709 \cdot 9$	$198 \cdot 4$
$8942 \cdot 4$	$6004 \cdot 9$	$504 \cdot 8$	$754 \cdot 5$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 81

840 : 10 = 84
8400 : 10 = 840
8400 : 100 = 8400 : (10 · 10) =
= (8400 : 10) : 10 = 840 : 10 = 84
84 000 : 1000 = 84 000 : (100 · 10) =
= (84 000 : 100) : 10 = 840 : 10 = 84

Каб падзяліць лік на разрадную адзінку (10, 100, 1000 і г. д.), трэба справа ад яго адкінуць столькі нулёў, колькі іх у дадзенай разраднай адзінцы.

1. Вылічы.

460 : 10	72 000 : 100	80 000 : 1000
720 : 10	5400 : 100	75 000 : 1000
280 : 10	9500 : 100	840 000 : 1000

2. Два цягнікі ехалі з аднолькавай скорасцю. Адзін прайшоў 480 км, а другі — 320 км. Першы цягнік быў у дарозе на 2 г больш за другі. Колькі часу быў у дарозе кожны цягнік?

3.

2674 * 2000 + 600 + 40 + 7
729 230 – 200 * 729 030
519 · 4 * 500 · 4 + 10 · 4 + 9
248 : 2 * 200 : 2 + 40 : 2 + 8 : 4

Правообладатель Пачатковая школа

4. Запоўні пропускі.

39 ц = ☐ т ☐ ц 8070 кг = ☐ т ☐ кг

12 780 м = ☐ км ☐ м 183 мін = ☐ г ☐ мін

3 см 9 мм = ☐ мм 197 с = ☐ мін ☐ с

5*. У пакоі, дзе гулялі дзеці, стаялі крэслы на чатырох ножках. Калі ўсе дзеці селі па адным у крэсла, то свабодных месцаў не засталося. Сума ног дзяцей і ножак крэслаў роўная 42. Колькі крэслаў стаяла ў пакоі? Колькі было дзяцей?

6. Выразі ў квадратных дэцыметрах:
2700 см²; 30 000 см²; 13 м²; 60 м².

7. Якія лічбы заменены зорачкамі?

$$\begin{array}{r} 48*3 \\ \times\quad 8 \\ \hline **58* \end{array} \qquad \begin{array}{r} **27 \\ \times\quad * \\ \hline 66*5 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 562* \\ \times\quad * \\ \hline 16**7 \end{array}$$

8. У спаборніцтвах па бегу ўдзельнічалі 140 спартсменаў. У кожнай камандзе было 8 мужчын і 6 жанчын. Колькі ўсяго мужчын удзельнічала ў спаборніцтвах? Колькі ўсяго жанчын?

У адной камандзе	Колькасць каманд	Усяго спартсменаў
мужчын 8	?	? } 140
жанчын 6		?

9. Рашы ўраўненні.

732 535 + y = 967 052 97 500 − y = 3449

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 82



Акружнасць — мяжа круга.

Акружнасць можна начарціць з дапамогай цыркуля.



Пункт, у які ставіцца вастрыё цыркуля, называецца **цэнтрам** акружнасці (пункт O).

Адрэзак, які злучае цэнтр акружнасці з якім-небудзь яе пунктам, называецца **радыусам**.



Усе радыусы акружнасці роўныя паміж сабой:

$$OA = OB$$

1. Начарці акружнасць з цэнтрам O і радыусам 4 см. Адзнач на акружнасці тры пункты і злучы іх з цэнтрам. Вымерай даўжыню радыусаў, зрабі вывад.

2. Назаві пункты, якія належаць акружнасці і кругу; толькі акружнасці; толькі кругу; не належаць ні акружнасці, ні кругу.



3. Складзі па схеме задачу і рашы яе пры c = 2 км; 3 км; 5 км.



Правообладатель Пачатковая школа

4. Вылічы.

892 · 9	6072 · 7	2343 · 8
3748 · 5	3005 · 4	8354 · 6
2689 · 6	6009 · 5	2506 · 5

5*. У школе 637 вучняў. Ці можна сцвярджаць, што хаця б адзін вучань нарадзіўся 14 лістапада? Што хаця б два вучні нарадзіліся ў адзін і той жа месяц? У адзін і той жа дзень?

6. Запішы велічыні ў парадку памяншэння.

а) 2 г; 2 кг; 20 000 г; 2 т; 21 ц; 2005 кг.

б) 1000 мм; 10 км; 1 м 1 дм; 100 см; 100 000 м.

7. Два прамавугольнікі маюць аднолькавую плошчу. Даўжыня першага 24 см, а шырыня 3 см. Чаму роўная даўжыня другога прамавугольніка, калі яго шырыня на 5 см большая за шырыню першага прамавугольніка?

8. Першая сям'я сабрала 27 мяхоў бульбы, а другая — 19 такіх мяхоў. Другая сям'я сабрала бульбы на 320 кг менш, чым першая. Колькі кілаграмаў бульбы сабрала кожная сям'я?

9. Вылічы.

2 м 6 дм − 1 м 50 см	400 г · 8	2 т 3 ц − 8 ц
4 т 500 кг + 26 ц	2 кг · 200	4 т 8 ц · 6

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 83

1. У два магазіны прывезлі цукеркі ў аднолькавых скрынках. У першы магазін даставілі 378 кг цукерак, а ў другі — 483 кг. Колькі скрынак з цукеркамі прывезлі ў другі магазін, калі першы атрымаў на 15 скрынак з цукеркамі менш?

	Маса ў адной скрынцы	Колькасць скрынак	Агульная маса
I	аднолькавая	?, на 15 менш	378 кг
II		?	483 кг

2. Начарці квадрат $ABCD$ са стараной 4 см. Злучы процілеглыя вяршыні адрэзкамі, як паказана на рысунку. Начарці акружнасць з цэнтрам O і радыусам 2 см. Что ты заўважыў? Ці належаць акружнасці вяршыні квадрата?



3. Выразі.

1 г 30 мін = * мін
46 ц = * кг
48 г = * сут
9300 см = * дм
48 000 м = * км
5800 ц = * т
360 с = * мін
2 сут 2 г = * г

Правообладатель Пачатковая школа

4*. На заводзе збіраюць дзіцячыя трохколавыя веласіпеды. Для веласіпеда трэба два маленькія колы і адно вялікае. Колькі веласіпедаў можна сабраць, калі ёсць 25 маленькіх колаў і 30 вялікіх?

5. Якімі могуць быць лічбы, адзначаныя *, каб няроўнасці былі правільныя?

32 489 > 3* 588	35 389 < 35 3*9
8* 785 < 80 7*3	7* 651 > 78 300
*3 210 > 82 101	903 40* < 903 401
*8 063 < 21 745	287 101 > 287 10*

6. Вылічы.

(9354 – 6999) · 3 + 11 026

(1111 – 409) · 3 + 10 505

7. Паменшы лік, які ідзе за лікам 50 999, на суму лікаў 34 761 і 2259.

8. Начарці прамавугольнік, стораны якога роўныя 5 см і 4 см. Зафарбуй $\frac{1}{10}$ яго плошчы. Колькі квадратных сантыметраў зафарбавана?

9. У ліцэі адна група навучэнцаў зрабіла 980 дэталяў, а другая — на 190 дэталяў менш. Усе дэталі расклалі ў скрынкі па 10 штук у кожную. Колькі скрынак спатрэбілася?

10. Рашы ўраўненні.

400 000 – x = 50 868

90 532 + y = 400 000

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 84

1. Цеплаход з турыстамі за першы дзень прайшоў 120 км, а за другі — 180 км. Ён рухаўся з аднолькавай скорасцю і ў другі дзень затраціў на свой шлях на 3 г больш, чым у першы. Колькі гадзін рухаўся цеплаход штодзень?



2. Вылічы.

7600 : 100	115 · 4 – 64 · 3 + 901
1800 : 10	804 : (622 – 618) + 3798
9000 : 1000	400 : 100 + (8189 – 2189)

3. Начарці адрэзак AB даўжынёй 3 см і акружнасць радыусам 1 см з цэнтрам у пункце A. Які радыус павінна мець акружнасць з цэнтрам у пункце B, каб акружнасці не перасякаліся? Зрабі адпаведныя чарцяжы.

4. Выразі:

а) у кілаграмах: 2 ц 27 кг; 27 т 4 кг; 13 т 1 ц; 3000 г; 17 т 7 ц 7 кг;

б) у цэнтнерах і кілаграмах: 4009 кг; 28 090 кг; 13 т 120 кг; 2 т 3 ц 4 кг.

5*. Кавалак дроту даўжынёй 78 см трэба разрэзаць на некалькі частак па 12 см і на некалькі частак па 15 см. Абрэзкаў не павінна застацца. Як гэта можна зрабіць?

Правообладатель Пачатковая школа

6. На 3 м чыгуначнага палатна выкарыстана 6 шпалаў. Колькі шпалаў спатрэбіцца, каб пабудаваць чыгуначную ветку даўжынёй 7 км 350 м?

Даўжыня чыгуначнага палатна	Колькасць шпалаў
3 м	6
7 км 350 м	?

7. Запішы найменшы чатырохзначны лік і найбольшы двухзначны лік. Знайдзі іх суму і павяліч яе ў 3 разы.

8. Назаві правільныя роўнасці.

6500 : 10 = 65 000 65 · 100 = 65 000
6500 : 10 = 650 65 · 1000 = 65 000

Якое дзеянне трэба выбраць, каб атрымаўся правільны адказ?

9. Рашы ўраўненні.

x – 192 704 = 214 298 3 · y = 1884
90 621 + a = 320 084 1520 : c = 10

10. Акула можа дасягаць у даўжыню 15 м. Кіт на 19 м даўжэйшы за акулу. Кракадзіл на 26 м карацейшы за кіта, а анаконда на 6 м карацейшая за акулу. Якую даўжыню маюць названыя жывёлы? Запішы іх даўжыні ў парадку памяншэння.

11.

$\frac{1}{5}$ км * 300 м 50 дзяс. * 400 адз.
50 дм² * 500 см² 20 сут * 2400 г
540 с * 5 г 200 см² * 20 дм²

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 85

Задача. З пунктаў A і B, адлегласць паміж якімі 21 км, адначасова адпраўляюцца ў дарогу і рухаюцца ў адным напрамку веласіпедыст і пешаход. Скорасць веласіпедыста 12 км/г, скорасць пешахода — 5 км/г. На колькі кіламетраў паменшыцца адлегласць паміж імі праз 1 г; 2 г; 3 г?



1. Вылічы.

3 м 15 см · 6	47 м 2 дм · 8
24 дм 5 см · 3	80 дм 14 мм · 7
3 ц 28 кг · 4	5 т 480 кг · 9

2. У двух мяхах 81 кг бульбы. Калі гэту бульбу раскласці пароўну ў пакеты, то бульба з аднаго меха змесціцца ў 12 пакетах, а бульба з другога — у 15 пакетах. Якая маса пакета бульбы?



Правообладатель Пачатковая школа

3. Якую долю складае 1 г ад 1 кг; 1 кг ад 1 ц; 1 кг ад 1 т; 1 ц ад 1 т?

4*. Перыметр прамавугольніка роўны 26 см, а яго плошча — 42 см^2. Чаму роўныя даўжыня і шырыня прамавугольніка?

5. Якія фігуры ты бачыш на рысунку? Колькі іх? Колькі тут прамавугольных трохвугольнікаў?



6. Параўнай без вылічэнняў.

$437 \cdot 18 * 2 \cdot 9 \cdot 437$	$968 \cdot 11 * 968 \cdot (10 + 1)$
$9 \cdot 300 + 9 \cdot 72 * 9 \cdot 372$	$243 \cdot 9 * 243 \cdot 10 - 1$

7. Выберы роўныя значэнні даўжыні і запішы адпаведныя роўнасці: 1545 м; 1 км 894 м; 5633 м; 1 км 545 м; 1894 м; 15 450 дм; 15 км 45 м; 18 940 дм; 563 300 см; 154 500 см; 5 км 633 м.

8. Складзі па ўмове задачы ўраўненне і рашы яго.
За два дні Маша прачытала 60 старонак кнігі. За першы дзень яна прачытала 28 старонак. Колькі старонак прачытала Маша за другі дзень?

9. Раман прачытаў дзве кнігі. У першай было 180 старонак, а ў другой — 270 старонак. Другую кнігу Раман чытаў на 3 дні больш, чым першую. Колькі дзён хлопчык чытаў кожную кнігу, калі штодня ён чытаў аднолькавую колькасць старонак?

10. Вылічы.

$6 \cdot 1287$	$7 \cdot 3952$	3 ц 25 кг · 3
$20\,408 \cdot 3$	$2 \cdot 5814$	2 сут 5 г · 2
$9 \cdot 1876$	$5 \cdot 8139$	5 км 600 м · 7

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 86

1. З горада ў адным напрамку выехалі два аўтамабілі. Першы аўтамабіль рухаўся са скорасцю 60 км/г, а другі — са скорасцю 90 км/г. Другі аўтамабіль выехаў на 2 г пазней за першы. Ці можа другі аўтамабіль дагнаць першы? Праз колькі гадзін? На якой адлегласці ад горада?

Адкажы на пытанні задачы, карыстаючыся рысункам і табліцай.

Час (г)	Адлегласць, якую прайшоў першы аўтамабіль (км)	Адлегласць, якую прайшоў другі аўтамабіль (км)	Адлегласць паміж аўтамабілямі (км)
1	60	—	60
2	120	—	120
3	180	90	90
4	240	180	60
5	300	270	30
6	360	360	0

2. Колькі ўсяго дзясяткаў, усяго сотняў у кожным ліку?

2750	31 000	42 000	45 050
1865	8277	98 751	90 000

Правообладатель Пачатковая школа

3. Вылічы.

47 517 · 6	9010 – 368 · 8	6050 · 9 + 899
287 100 · 4	6150 + 257 · 9	9020 · 3 – 699

4. Начарці акружнасць з цэнтрам у пункце O, радыус якой роўны 20 мм. Адзнач пункт P на акружнасці, пункт K унутры акружнасці, пункт M па-за акружнасцю. Правядзі адрэзкі OP, OK, OM. Запішы правільныя няроўнасці.

5*. Колькі лікаў ад 1 да 50 дзеліцца і на 2, і на 3?

6. Адкажы на пытанні.

а) На колькі невядомае складаемае меншае за суму $x + 20\,000 = 50\,000$?

б) На колькі дзялімае большае за дзель $x : 4 = 3200$?

7. Вылічы.

7 ц 28 кг · 7	2 г 40 мін · 6
60 т 250 кг · 3	3 сут 15 г · 8
14 км 200 м · 9	15 кг 350 г · 5

8. Знайдзі: $\frac{1}{5}$ ц; $\frac{1}{8}$ т; $\frac{1}{4}$ км; $\frac{1}{8}$ сут; $\frac{1}{5}$ кг.

9. Андрэй прачытаў аповесць за два дні. За першы дзень ён прачытаў 18 старонак. Гэта на 10 старонак менш, чым ён прачытаў за другі дзень. Колькі старонак у аповесці?

10.

26 дм * 2626 мм	8 т 69 кг * 86 ц
2 г 25 с * 160 с	130 сут * 6 мес.
7 км 25 м * 7250 м	3 ц 61 кг * 3060 кг

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 87

1. Дзве аўтамашыны выехалі адначасова з двух гарадоў у адным напрамку. Скорасць першай машыны 50 км/г, а скорасць другой — 60 км/г. Праз 4 г другая машына дагнала першую. Знайдзі адлегласць паміж гарадамі.



2. Вылічы.

25 800 · 2 + 2800	149 200 · 5 – 288 220
40 000 – 4550 · 5	605 705 + 170 350 : 10
(83 275 – 81 403) · 10	(384 + 3467) · 7

3. Радыус акружнасці з цэнтрам O роўны 2 см, што ў 2 разы менш за радыус акружнасці з цэнтрам A. Начарці акружнасць з цэнтрам A.

4*. Мама купіла мандарыны. Старэйшаму сыну яна аддала $\frac{1}{3}$, сярэдняму — палову астачы, 7 мандарынаў дала дачцэ і 7 пакінула сабе. Колькі мандарынаў купіла мама?



Правообладатель Пачатковая школа

5. З якой колькасці кубікаў складзены фігуры на рысунках?





6. Вылічы зручным спосабам.

700 : (10 · 7)	210 : (7 · 3)	800 : (20 · 5)
540 : (9 · 10)	490 : (2 · 5)	810 : (9 · 10)

7. Запоўні пропускі.

11 т = ☐ ц	3 т 8 кг = ☐ кг
60 ц = ☐ кг	2 т 3 ц = ☐ кг
4 т 28 кг = ☐ кг	8 ц 50 кг = ☐ кг

8. Першую друкаваную кнігу Францыск Скарына выдаў у 1517 годзе. У якім стагоддзі гэта адбылося? Колькі стагоддзяў прайшло з той пары?

9. З аднаго кавалка тканіны пашылі 15 халатаў, а з другога — 4 такія самыя халаты. У першым кавалку тканіны на 55 м больш, чым у другім. Колькі метраў тканіны пайшло на адзін халат?

10. Рашы ўраўненні.

$402 : x = 96 : 16$ $5 \cdot y = 905 \cdot 2$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 88

4822 : 2 = □

Першае няпоўнае дзялімае: 4 тыс. (4 > 2).
Дзялю: 4 : 2 = 2 (тыс.).
Множу: 2 · 2 = 4 (тыс.).
Аднімаю: 4 − 4 = 0 (астача роўная 0).

Другое няпоўнае дзялімае: 8 сот.
Дзялю: 8 : 2 = 4 (сот.).
Множу: 4 · 2 = 8 (сот.).
Аднімаю: 8 − 8 = 0 (астача роўная 0).

Трэцяе няпоўнае дзялімае: 2 дзяс.
Дзялю: 2 : 2 = 1 (дзяс.).
Множу: 1 · 2 = 2 (дзяс.).
Аднімаю: 2 − 2 = 0 (астача роўная 0).

Чацвёртае няпоўнае дзялімае: 2 адз.
Дзялю: 2 : 2 = 1 (адз.).
Множу: 1 · 2 = 2 (адз.).
Аднімаю: 2 − 2 = 0 (астача роўная 0).

Адказ: 2411.

```
 4822 | 2
−4   | 2411
 8
−8
 2
−2
 2
−2
 0
```

1. Знайдзі дзель і правер адказ множаннем.

8442 : 2 3699 : 3 4884 : 4 4284 : 2

2. Якія лікі запісаны сумамі разрадных складаемых?

4 · 10 + 5 · 100 + 5 + 4 · 1000
4 · 100 + 2 + 6 · 10
9 · 10 + 3 · 100 + 7 + 9 · 1000

Правообладатель Пачатковая школа

3. Дзве маторныя лодкі адышлі ад берага ў розны час, але ў адным напрамку. Першая ішла са скорасцю 15 км/г, а другая — са скорасцю 20 км/г і выйшла на 1 г пазней. Праз колькі гадзін і на якой адлегласці ад месца адпраўлення другая лодка дагоніць першую?

4. Параўнай без вылічэнняў.

83 200 : 8 * 80 032 : 8 85 000 : 2 * 85 000 : 5
62 400 : 6 * 60 240 : 6 72 800 : 4 * 72 800 : 8

5*. 10 экскаватараў за 10 мін дастаюць 10 т грунту. За колькі мінут 25 такіх экскаватараў дастануць 25 т грунту?

6. З дапамогай цыркуля знайдзі на рысунку роўныя адрэзкі. Начарці адрэзак, роўны адрэзку AC.



7. Дапішы патрэбныя назвы велічынь.

83 см = 830 … 12 дм = 120 …
9 км = 9000 … 6800 кг = 68 …

8. На заправачную станцыю прывезлі 4800 л паліва. У першы дзень прадалі $\frac{1}{4}$ усяго паліва, а ў другі дзень — $\frac{1}{6}$ астачы. На колькі больш паліва і ў які з двух дзён прадалі на заправачнай станцыі?

9. Вылічы.

33 303 · 3 + 11 224 · 5 456 075 − 2988 + 8800 : 4

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 89

9248 : 4 = □

Першае няпоўнае дзялімае: 9 тыс. (9 > 4).
Дзялю: 9 : 4, пробная лічба — 2.
Множу: 2 · 4 = 8 (тыс.).
Аднімаю: 9 − 8 = 1 (тыс.).
Параўноўваю: 1 < 4.

9248	4
8	2312
12	
12	
4	
4	
8	
8	
0	

Другое няпоўнае дзялімае:
1 тыс. + 2 сот. = 12 сот.
Дзялю: 12 : 4 = 3 (сот.).
Множу: 3 · 4 = 12 (сот.).
Аднімаю: 12 − 12 = 0 (астача роўная 0).

Трэцяе няпоўнае дзялімае: 4 дзяс.
Дзялю: 4 : 4 = 1 (дзяс.).
Множу: 1 · 4 = 4 (дзяс.).
Аднімаю: 4 − 4 = 0 (астача роўная 0).

Чацвёртае няпоўнае дзялімае: 8 адз.
Дзялю: 8 : 4 = 2 (адз.).
Множу: 2 · 4 = 8 (адз.).
Аднімаю: 8 − 8 = 0 (астача роўная 0).

Адказ: 2312.

1. Вылічы.

48 716 : 4	27 354 : 6	14 744 : 8
64 729 : 7	233 772 : 7	46 846 : 2

2. Якія лічбы абазначаны літарамі m і k у прыкладзе $m00 \cdot k = 600$? Знайдзі чатыры адказы.

Правообладатель Пачатковая школа

3. Для трох новых дамоў прывезлі 4808 аконных рам. Першы дом атрымаў $\frac{1}{4}$ усіх рам, другі дом — на 104 рамы больш за першы. Колькі рам атрымаў трэці дом?

4. Плошча прамавугольніка $ABCD$ роўная 56 м², дзе AB = 7 м. Ад гэтага прамавугольніка аддзялілі частку $KMAB$, дзе старана BK роўная 6 м. Знайдзі плошчу часткі $KMAB$.



5*. У Пеці ў 6 разоў больш арэхаў, чым у Вані. Калі Пеця з'есць 10 арэхаў, то ў іх з Ванем будзе арэхаў пароўну. Колькі арэхаў было ў кожнага хлопчыка спачатку?

6. Запішы тры значэнні a, пры якіх няроўнасць $a < 207\,986$ будзе правільная.

7. □□□ * □□□□

45□□□ * 48□□□

□□24□ * 578

□5□□ * 13□□

8. Гаспадарка адправіла ў магазін 2 т 500 кг малін. Гэта на 650 кг менш, чым вішань. Парэчак было адпраўлена на 1 т 80 кг менш, чым малін і вішань разам. Колькі парэчак гаспадарка адправіла ў магазін?

9. Вылічы.

86 345 : 5 38 576 : 4 134 542 : 2

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 90

7356 : 3 = □

Першае няпоўнае дзялімае: 7 тыс. (7 > 3).
У дзелі будзе чатыры лічбы:
тысячы, сотні, дзясяткі, адзінкі.

Дзялю: 7 : 3, пробная лічба — 2.
Множу: 2 · 3 = 6 (тыс.).
Аднімаю: 7 − 6 = 1 (тыс.).
Параўноўваю: 1 < 3.

7356	3
6	2452
13	
12	
15	
15	
6	
6	
0	

Другое няпоўнае дзялімае:
1 тыс. + 3 сот. = 13 сот.
Дзялю: 13 : 3, пробная лічба — 4.
Множу: 4 · 3 = 12 (сот.).
Аднімаю: 13 − 12 = 1 (сот.).
Параўноўваю: 1 < 3.

Трэцяе няпоўнае дзялімае:
1 сот. + 5 дзяс. = 15 дзяс.
Дзялю: 15 : 3 = 5 (дзяс.).
Множу: 5 · 3 = 15 (дзяс.).
Аднімаю: 15 − 15 = 0 (астача роўная 0).

Чацвёртае няпоўнае дзялімае: 6 адз.
Дзялю: 6 : 3 = 2 (адз.).
Множу: 2 · 3 = 6 (адз.).
Аднімаю: 6 − 6 = 0 (астача роўная 0).
Адказ: 2452.

Правообладатель Пачатковая школа

1. Колькі лічбаў будзе ў дзелі?

453 460 : 4 885 296 : 4 798 798 : 7

2. Выканай дзяленне з тлумачэннем.

656 : 4 6568 : 4 65 688 : 4

3. Вучні чацвёртых класаў пасадзілі разам 690 дрэў. У 4 «А» класе было 20 вучняў, у 4 «Б» — 25 вучняў, а ў 4 «В» — 24 вучні. Колькі дрэў пасадзіў кожны клас, калі кожны вучань пасадзіў аднолькавую колькасць дрэў?

4. Вылічы.

190 + 190 · 3 260 · 4 − 260

240 · 6 − 240 32 · 4 + 32 · 6

5. Майстар з прамавугольнага кавалка фанеры даўжынёй 65 см і шырынёй 30 см выразаў прамавугольнік памерам 20 × 15 см. Знайдзі плошчу часткі фанеры, якая засталася.



6.

□□□□□ * □□□□

54□□ * 55□□

326 * □2□6

□246 * 1□□□1

7. Маса кавалка сыру 900 г. За сняданкам з'елі $\frac{1}{3}$ усяго сыру, за вячэрай — $\frac{1}{10}$ астачы. Колькі грамаў сыру з'елі за вячэрай?

8. Вылічы.

7392 : 6	2916 : 2	8223 : 3	74 538 : 6
34 455 : 3	64 116 : 3	9737 : 7	950 768 : 8

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 91

1368 : 2 = □

Першае няпоўнае дзялімае:
13 сот. (1 < 2, 13 > 2).
У дзелі будзе тры лічбы:
сотні, дзясяткі, адзінкі.

Дзялю: 13 : 2, пробная лічба — 6.
Множу: 6 · 2 = 12 (сот.).
Аднімаю: 13 − 12 = 1 (сот.).
Параўноўваю: 1 < 2.

```
 1368 | 2
 12   | 684
 16
 16
  8
  8
  0
```

Другое няпоўнае дзялімае:
1 сот. + 6 дзяс. = 16 дзяс.
Дзялю: 16 : 2 = 8 (дзяс.).
Множу: 8 · 2 = 16 (дзяс.).
Аднімаю: 16 − 16 = 0 (астача роўная 0).

Трэцяе няпоўнае дзялімае: 8 адз.
Дзялю: 8 : 2 = 4 (адз.).
Множу: 4 · 2 = 8 (адз.).
Аднімаю: 8 − 8 = 0 (астача роўная 0).
Адказ: 684.

1. Вылічы.

136 : 4 384 : 6 6587 : 7 4455 : 5

2. У адным меху было 56 кг мукі, а ў другім — 24 кг. Усю муку расфасавалі ў 40 пакетаў пароўну. Колькі пакетаў спатрэбілася для расфасоўкі мукі з кожнага меха?

Правообладатель Пачатковая школа

3. Выразі:

а) у секундах — 3 мін; 20 мін; 100 мін; 4 мін 20 с;
б) у кілаграмах — 2 т 5 ц; 30 ц 50 кг; 65 т 20 ц.

4. Шырыня прамавугольніка 3 см 4 мм, а даўжыня — у 2 разы большая. Вылічы яго перыметр.

5*.

На рысунку — Коля, Алег, Міша, Толя і Барыс. Міша не самы высокі, але ён вышэйшы за Толю, Алега і Колю. Алег стаіць побач з Колем і ніжэйшы за яго. Толю, каб дацягнуцца да выключальніка, прыходзіцца падстаўляць лавачку або прасіць дапамогі ў свайго старэйшага брата — Алега. У якім парадку стаяць хлопчыкі?

6. Рашы ўраўненні.

$1338 : x = 3$ $x : 4 = 1025$

7. Вольга задумала лік, які дзеліцца на 5. Ён большы за 250, але меншы за 260. Што гэта за лік?

8. З дзвюх вёсак, якія знаходзяцца на адлегласці 27 км, адначасова насустрач адзін аднаму выйшлі два пешаходы. Праз 3 г яны сустрэліся. Першы пешаход ішоў са скорасцю 5 км/г. З якой скорасцю ішоў другі пешаход? Рашы задачу двума спосабамі.

9. Вылічы.

$2367 : 3$	$5964 : 7$	$700\,000 - 42\,008 \cdot 6$
$4104 : 9$	$6669 : 9$	$5600 \cdot 8 + 5065$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 92

432 : 4 = □

Першае няпоўнае дзялімае: 4 сот. (4 = 4).

У дзелі будзе тры лічбы: сотні, дзясяткі, адзінкі.

Дзялю: 4 : 4 = 1 (сот.).
Множу: 1 · 4 = 4 (сот.).
Аднімаю: 4 − 4 = 0 (астача роўная 0).

Другое няпоўнае дзялімае: 3 дзяс.

Дзялю: 3 : 4 = 0 (дзяс.).
Множу: 0 · 4 = 0 (дзяс.).
Аднімаю: 3 − 0 = 3 (дзяс.).
Параўноўваю: 3 < 4.

Трэцяе няпоўнае дзялімае: 3 дзяс. + 2 адз. = 32 адз.

Дзялю: 32 : 4 = 8 (адз.).
Множу: 8 · 4 = 32 (адз.).
Аднімаю: 32 − 32 = 0 (астача роўная 0).
Адказ: 108.

```
−432 | 4
 4   | 108
 −3
  0
 −32
  32
   0
```

або

```
−432 | 4
 4   | 108
 −32
  32
   0
```

1. Вылічы.

812 : 4	654 : 6	828 : 4	612 : 2
918 : 3	535 : 5	819 : 9	432 : 3

2. Пры якім значэнні x дзель 300 : x прымае найменшае значэнне?

Правообладатель Пачатковая школа

3. У 11 г з аэрадрома адначасова ў процілеглых напрамках вылецелі два самалёты. У 14 г адлегласць паміж імі была 3540 км. Скорасць аднаго самалёта 620 км/г. Знайдзі скорасць другога самалёта.



4. Сума двух лікаў роўная 7, а іх здабытак — 10. Знайдзі гэтыя лікі.

5*. З кнігі выпала некалькі аркушаў. Першая старонка з тых, што выпалі, мае нумар 25, а нумар апошняй запісваецца тымі ж лічбамі, але ў зваротным парадку. Колькі аркушаў выпала з кнігі?

6.

8 м 9 дм * 8 м 99 см
31 км 100 м * 30 101 м
4 т 5 ц * 55 кг
55 ц * 5 т

7. Начарці адрэзкі даўжынёй 1 см, 3 см, 44 мм, выкарыстоўваючы цыркуль і лінейку.

8. За дзень у магазіне прадалі 6 мяхоў грэцкіх круп і 3 такія ж мяхі рысавых круп. Рысу прадалі на 150 кг менш, чым грэчкі. Колькі кілаграмаў грэцкіх круп прадалі за дзень?

9. Вылічы.

612 : 3
814 : 2
208 : 4

124 509 + (107 601 − 7602)
41 225 − 612 : 3
(372 + 209) − (7245 − 7082)

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 93

9030 : 3 = □

Першае няпоўнае дзялімае: 9 тыс. (9 > 3).
У дзелі будзе чатыры лічбы.
9 : 3 = 3 (тыс.)

Другое няпоўнае дзялімае: 0 сот.
0 : 3 = 0 (сот.)

Трэцяе няпоўнае дзялімае: 3 дзяс.
3 : 3 = 1 (дзяс.)

Чацвёртае няпоўнае дзялімае: 0 адз.
0 : 3 = 0 (адз.)

Адказ: 3010.

9030	3
9	3010
3	
3	
0	

1. Вылічы.

22 224 : 3	48 230 : 5	64 072 : 8
27 009 : 9	9460 : 5	7209 : 9

2. Першы аўтобус зрабіў за дзень 4 рэйсы, другі — 6 рэйсаў. Кожны рэйс яны перавозілі аднолькавую колькасць пасажыраў. Першы аўтобус перавёз на 94 чалавекі менш, чым другі. Колькі пасажыраў перавёз за дзень кожны аўтобус?

3. Колькі ўсяго адзінак, дзясяткаў, сотняў, тысяч, дзясяткаў тысяч змяшчае лік 569 380?

Правообладатель Пачатковая школа

4*. Найбольшы трохзначны лік падзялі на дзве часткі так, каб адна частка была ў 2 разы большая за другую. Знайдзі гэтыя лікі.

5. Перыметр прамавугольніка 80 мм, даўжыня ў 3 разы большая за шырыню. Вылічы даўжыню і шырыню гэтага прамавугольніка.



6. Вылічы.

3 сут 15 г + 15 г	56 кг · 8
1 г 25 мін − 45 мін	35 ц − 4 ц 29 кг
3 г 20 мін − 75 мін	2 т + 65 ц

7. Запішы лік, у якім:

а) 27 адзінак другога класа і 27 адзінак першага класа;
б) 30 адзінак другога класа;
в) 6 адзінак V разраду і 6 адзінак I разраду;
г) 7 адзінак VI разраду і 1 адзінка I разраду;
д) 3 адзінкі другога класа і 3 адзінкі II разраду.

8. За першы квартал у горадзе пабудавалі 5 аднолькавых дамоў, а за другі — 8 такіх жа дамоў. Усяго ў гэтых дамах 260 кватэр. Колькі кватэр пабудавана ў першым квартале і колькі ў другім?

9. Рашы ўраўненні.

$5 \cdot a = 4820$	$b \cdot 6 = 5922$
$3717 : e = 9$	$80\,395 : k = 5$
$9 \cdot a = 7542$	$x \cdot 7 = 2289$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 94

9 т 352 кг : 2 = □

9 т 352 кг = 9352 кг
9352 : 2 = 4676
4676 кг = 4 т 676 кг

```
 9352 | 2
-8   | 4676
 13
-12
 15
-14
 12
-12
  0
```

1. Вылічы.

9905 см : 7	4 мін 38 с : 2
4 ц 8 кг : 8	7 т 8 кг : 4
27 дм 9 см : 3	4 км 80 м : 4

2. Маслазавод адправіў у тры магазіны 340 кг алею. Адзін магазін атрымаў $\frac{1}{5}$ усяго алею, другі — $\frac{1}{4}$ таго алею, што застаўся, а трэці — астачу. Колькі кілаграмаў алею атрымаў кожны магазін?



3. Знайдзі дзель.

7380 : 9 3010 : 5 4260 : 6 8220 : 3

4. Рашы ўраўненні.

$x : 4 = 2049$	$x + 7094 = 9703$
$8601 : x = 3$	$x - 504 = 7609$

Правообладатель Пачатковая школа

5*. У класе 35 вучняў. З іх 20 займаюцца ў матэматычным гуртку, 11 — у гуртку «Умелыя рукі», 10 вучняў не ходзяць у гэтыя гурткі. Колькі вучняў з матэматычнага гуртка займаюцца ў гуртку «Умелыя рукі»? Колькі вучняў з матэматычнага гуртка не ходзяць у гурток «Умелыя рукі»?



6. Выразі.

240 с = * мін	302 т 4 ц = * ц
32 000 м = * км	168 г = * сут
8500 ц = * т	14 мін = * с

7. Даўжыня прамавугольніка 2 см 6 мм, а шырыня — у 2 разы меншая. Вылічы перыметр прамавугольніка.

8. На складзе было 1240 м шарсцяной тканіны, а льняной — у 2 разы больш. У краму завезлі адну чвэрць шарсцяной і пятую долю льняной тканіны. Колькі ўсяго метраў шарсцяной і льняной тканіны завезлі ў краму?

9. Вылічы.

84 020 : 4	86 040 : 2	609 030 : 3
250 050 : 2	428 004 : 4	84 004 : 4

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 95

1. У кніжнай шафе 84 кнігі. На другой паліцы кніг у 2 разы больш, чым на першай, а на трэцяй — у 3 разы больш, чым на першай. Колькі кніг на кожнай паліцы?



2. Вылічы.

60 ц : 5	20 м 40 см : 5	63 км 900 м : 3
24 м 80 см : 4	16 т : 2	18 дм 60 см : 3

3. Колькі чатырохвугольнікаў са стараной AB на рысунку?



4. Перыметр прамавугольніка 42 см. Якая даўжыня і шырыня прамавугольніка, калі даўжыня ў 2 разы большая за шырыню?

5. З дадзеных значэнняў велічынь складзі і запішы дзве правільныя няроўнасці і адну правільную роўнасць: 2 т 800 кг; 280 кг; 28 ц.

Правообладатель Пачатковая школа

6. Вылічы.

44 264 : 8 + 5436 : 6	700 003 – 328 448 : 4
35 532 : 9 · 4 + 15 618	60 001 – 4007 · 4

7. З аднаго горада ў другі адначасова выехалі аўтобус і матацыкл. Скорасць аўтобуса 70 км/г, скорасць матацыкла — 85 км/г. Праз які час адлегласць паміж імі будзе 60 км?

8. Падстаў замест * патрэбныя лічбы.

2*37 < 2846	34*5 < 3442	6403 < 64*0
5*73 < 5265	8*4 < 846	5368 > 53*8

9. У трох дамах жывуць 3600 жыхароў. У першым доме жыве адна чвэрць усіх жыхароў, у другім — на 100 чалавек больш, чым у першым. Колькі чалавек жыве ў трэцім доме?

10. Вылічы.

7070 : 7	8274 : 3 · 2 + 27 327
24 024 : 8	81 010 – 5001 · 9

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 96

1. Фермер вывез на рынак аднолькавую колькасць скрынь яблыкаў і груш. Скрыня груш важыць 50 кг, а скрыня яблыкаў — 40 кг. Усе скрыні з садавіной разам важаць 810 кг. Колькі ўсяго скрынь з садавіной фермер вывез на рынак? Якія яшчэ пытанні можна паставіць да задачы?



2. Вылічы.

8 км 124 м : 3	44 км 67 м : 3
30 т 247 кг : 7	52 кг 353 г : 3
17 км 250 м : 6	5 мін 20 с : 4
7 ц 8 кг : 4	58 т 35 кг : 5

3. Дадзены значэнні a: 13; 0; 603; 1306; 106; 3061; 63. Пры якіх з іх няроўнасць $8030 > 6724 + a$ будзе правільная?

4*. Паліна выразала 20 фігур: кругоў, квадратаў, трохвугольнікаў. Квадратаў было ў 6 разоў больш, чым трохвугольнікаў, а кругоў менш, чым квадратаў. Колькі кругоў выразала Паліна?

5. Выразі:

а) у сантыметрах і міліметрах — 3569 мм; 5545 мм; 5 м 3 мм; 45 дм 25 мм;

б) у больш буйных адзінках вымярэння — 166 000 м; 40 ц; 120 мін; 24 000 г; 7200 с; 7000 см; 6400 кг; 25 ц.

Правообладатель Пачатковая школа

6.

52 см * 5 м 2 см
170 дм * 17 м
3 г 15 мін * 315 мін
7 т 80 кг * 78 ц

7. Два ўчасткі лесу прамавугольнай формы маюць аднолькавую плошчу. Шырыня першага ўчастка 8 км, а шырыня другога — 6 км. Знайдзі даўжыню першага ўчастка, калі даўжыня другога — 12 км.

8. Рашы ўраўненні.

$x + 250 = 6810 : 3$ $x - 420 = 603 \cdot 7$

9. Павяліч у 10 разоў.

30 дм 5 см; 50 кг 20 г; 7 т 250 кг; 2 км 300 м.

10. Аўтамабіль і матацыкл выехалі адначасова ў адным напрамку. Аўтамабіль ехаў са скорасцю 75 км/г, а матацыкл — са скорасцю 67 км/г. Якую адлегласць праехаў матацыкл, калі аўтамабіль апярэдзіў яго на 32 км?



11. Рашы спачатку тыя прыклады, у якіх колькасць лічбаў у дзелі і дзялімым аднолькавая, а потым тыя, у якіх у дзелі лічбаў менш, чым у дзялімым.

5624 : 4	5484 : 3	534 136 : 4
3228 : 4	4224 : 6	47 550 : 5
1506 : 6	6768 : 8	99 944 : 8

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 97

648 · 30 = □

648 · 30 = 648 · (3 · 10) =
= (648 · 3) · 10 =
= 1944 · 10 = 19 440

$$\begin{array}{r} {\scriptstyle 1\,2}\\ 648\\ \times\quad 30\\ \hline 19440 \end{array}$$

753 · 500 = □

753 · 500 = 753 · (5 · 100) =
= (753 · 5) · 100 =
= 3765 · 100 = 376 500

$$\begin{array}{r} {\scriptstyle 2\,1}\\ 753\\ \times\quad 500\\ \hline 376500 \end{array}$$

1. Вылічы.

432 · 70	648 · 300	50 · 312 – 30 · 312
203 · 80	200 · 1803	75 · 440 + 25 · 440

2. 15 канвертаў на 1 р. 50 к. даражэйшыя, чым 10 паштовак, якія маюць такую самую цану. Колькі каштуюць канверты? Колькі каштуюць паштоўкі?

Цана	Колькасць	Кошт
аднолькавая	15 шт.	**?**, на 1 р. 50 к. больш
	10 шт.	**?**

3. З прамавугольніка, даўжыня якога 9 см, а шырыня 7 см, выразалі квадрат са стараной 5 см. Знайдзі плошчу фігуры, што засталася.



Правообладатель Пачатковая школа

4*. Дачцэ 3 гады, а маці 31 год. Праз колькі гадоў маці будзе ў 3 разы старэйшая за дачку?

5. Вылічы.

13 км 852 м : 4	46 кг : 8	8 см 6 мм · 4
32 т 256 кг : 7	4 дм 6 см · 2	45 мін · 7

6. Рашы ўраўненні.

$x \cdot 7 = 210\,959$	$570\,960 : a = 8$
$a : 300 = 1281$	$3 \cdot x = 1971$

7. На колькі роўных частак падзелены квадрат? Начарці асобна $\frac{1}{2}$, $\frac{1}{4}$, $\frac{1}{8}$ квадрата.



8. Выразі:

а) у сантыметрах — 35 м; 5 м 3 дм; 1700 мм; 40 м 30 мм;
б) у метрах — 3 км 200 м; 7800 дм; 6300 дм.

9. Ад адной прыстані адначасова ў процілеглых напрамках адышлі дзве маторныя лодкі. Адна ішла са скорасцю 250 м/мін, а другая — са скорасцю 200 м/мін. На якой адлегласці адна ад адной будуць лодкі праз 4 мін?



10. Вылічы.

19 242 : 6	542 · 300	680 700 − 329 876
72 054 · 9	194 · 200	2694 + 13 458

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 98

1290 · 700 = □

$$\begin{array}{r} {\scriptstyle 2\ 6} \\ 1290 \\ \times\ \ 700 \\ \hline 903000 \end{array}$$

7600 · 30 = □

$$\begin{array}{r} {\scriptstyle 1} \\ 7600 \\ \times\ \ 30 \\ \hline 228000 \end{array}$$

1. Вылічы.

130 · 500	3600 · 70	1870 · 400
160 · 900	1980 · 40	1900 · 300
1400 · 500	2960 · 20	270 · 600

2. У школьны кіёск паступіла 600 сшыткаў. У першы дзень прадалі $\frac{1}{3}$ усёй колькасці сшыткаў, а ў другі — $\frac{1}{8}$ астачы. Колькі сшыткаў прадалі за два дні?

3. Перыметр прамавугольніка 100 см, даўжыня — 30 см. Вылічы плошчу прамавугольніка і выразі ў квадратных дэцыметрах.

4*. На вуліцы, стаўшы ў кружок, гутараць 4 дзяўчынкі: Аня, Валя, Галя, Надзя. Дзяўчынка ў зялёнай сукенцы (не Аня і не Валя) стаіць паміж дзяўчынкай у аранжавай сукенцы і Надзяй. Дзяўчынка ў чырвонай сукенцы стаіць паміж дзяўчынкай у блакітнай сукенцы і Валяй. Якога колеру сукенка ў кожнай дзяўчынкі?

Правообладатель Пачатковая школа

5. Мама выходзіць на работу ў 8 г раніцы. Рабочы дзень з перапынкам на абед у яе працягваецца 9 г, а дарога ў два бакі займае 1 г. Калі мама вернецца дадому?

6. Якія лічбы ў здабытку абазначаюць літары K і B?

$K00 \cdot B00 = 210\,000$

7. Начарці акружнасць радыусам 4 см. Начарці адрэзак AB так, каб ён знаходзіўся ўнутры акружнасці. Якой даўжыні можа быць адрэзак AB?

8. Знайдзі значэнне выразу $a : b$, калі:

а) $a = 7020$ і $b = 6$;
б) $a = 6006$ і $b = 3$.

9. На ўваход вылічальнай машыны пададзены лікі 32; 908; 1200. Якія лікі атрымаюцца на выхадзе?



10. Назаві тры лікі, пры якіх няроўнасць $a < 300\,000$ будзе правільная.

11. У краму прывезлі 164 л сланечнікавага алею і 3 аднолькавыя ёмістасці з аліўкавым алеем. Усяго прывезлі 236 л алею. Колькі аліўкавага алею ў адной ёмістасці?

12. Вылічы.

60 608 – 43 829	2873 + 351 747
40 096 · 2	12 474 : 7

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 99

1. Вылічы.

1520 · 40	3800 · 500	7050 · 20
4900 · 30	2600 · 20	8900 · 400
5050 · 20	7800 · 30	6490 · 400

2. З участка плошчай 15 га сабралі на 120 т бульбы больш, чым з участка плошчай 9 га. Колькі бульбы сабралі з кожнага ўчастка, калі ўраджайнасць на абодвух участках аднолькавая?

3. Цана аднаго пакета цукру 1 р. 50 к. Колькі каштуюць 6 такіх пакетаў? Складзі і рашы адваротныя задачы.

4. Пастаў дужкі так, каб роўнасці былі правільныя.

40 · 18 – 12 : 3 = 80	5 · 8 + 40 : 10 = 8
40 · 18 – 12 : 3 = 236	780 : 6 + 91 : 13 = 60
40 · 18 – 12 : 3 = 560	144 + 72 : 2 · 3 = 156

5*. Саша выразаў з каляровай паперы 18 чырвоных, 21 зялёны, 11 сініх і некалькі жоўтых кругоў. Сініх кругоў было менш, чым жоўтых, на столькі, на колькі зялёных кругоў было больш, чым чырвоных. Колькі жоўтых кругоў выразаў Саша?

6. Вылічы.

3780 : 4 + (129 317 – 128 939)
760 · 20 – 72 405 : 5

Правообладатель Пачатковая школа

7. Вылічы.

4 т 200 кг – 2 т 300 кг	1 км 645 м : 7
6 кг 350 г – 4 кг 275 г	5 кг 332 г · 4
4 г 30 мін – 1 г 45 мін	4 сут 8 г : 2

8. Плошча прамавугольніка 48 м^2. Чаму роўныя даўжыня і шырыня прамавугольніка, калі даўжыня ў 3 разы большая за яго шырыню?



9. Разгледзь дыяграму і адкажы на пытанні. Які рост у Тані? У каго рост 140 см? Хто з дзяцей па росце меншы за ўсіх? Хто з дзяцей на 40 см вышэйшы за Таню? На колькі сантыметраў Оля ніжэйшая за Віцю? Параўнай рост Олі і Сашы.



10. Ад прыстані адначасова ў адным напрамку адышлі цеплаход са скорасцю 33 км/г і катар са скорасцю 21 км/г. Якая адлегласць будзе паміж імі праз 3 г?



11. Выканай дзяленне з астачай.

252 : 5	125 : 3	160 : 3
74 : 8	420 : 8	250 : 4

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 100

8400 : 70 = 8400 : (10 · 7) =
= (8400 : 10) : 7 = 840 : 7 = 120

8400 : 70 = (7000 + 1400) : 70 =
= 7000 : 70 + 1400 : 70 =
= (7000 : 10) : 7 + (1400 : 10) : 7 =
= 100 + 20 = 120

1. Выканай дзяленне.

480 : 80	5400 : 90	8100 : 90	4200 : 30
360 : 60	1800 : 30	6400 : 80	7800 : 60
360 : 30	2100 : 70	4200 : 60	48 000 : 400

2. У дзвюх бочках была аднолькавая колькасць вады. Калі з першай бочкі ўзялі $\frac{1}{4}$ вады, а з другой — 50 л, то вады ў бочках засталося пароўну. Колькі літраў вады было ў дзвюх бочках разам?



3. Знайдзі масу.

а) Маса ўсёй садавіны на ўсіх вагах роўная 600 г. Якая маса яблыка?

б) Маса яблыка ☐ г (гл. *а*). Якая маса лімона?



Правообладатель Пачатковая школа

4. Колькі гектараў складаюць: 10 000 м^2; 200 000 м^2; 70 000 м^2?

5*. У трох братоў 9 сшыткаў. У малодшага брата на 1 сшытак менш, чым у сярэдняга, а ў старэйшага брата — на 1 сшытак больш, чым у сярэдняга. Колькі сшыткаў у кожнага брата?



6. Вучні чацвёртых класаў збіралі плады шыпшыны. 4 «А» клас сабраў 7 кг, 4 «Б» — на 4 кг больш, чым 4 «А», а 4 «В» — удвая больш, чым 4 «А». Колькі кілаграмаў шыпшыны сабраў кожны клас? Нарысуй дыяграму ў выглядзе слупкоў, прыняўшы 1 клетку сшытка за 1 кг.

7. Рашы ўраўненні.

$80\,009 - x = 29\,368$ $\qquad$ $x : 8 = 136$

$4214 : x = 7$ $\qquad$ $3128 - x = 2019$

8. Даўжыня класа 12 м, а шырыня — 10 м. У класе 1 настаўнік і 29 вучняў. Колькі квадратных метраў плошчы прыпадае на аднаго чалавека?

9. Вылічы.

$53\,856 : 6 - 6981 : 3$ $\qquad$ $(294\,883 - 49\,295 - 294) : 7$

$6400 : 80 + 70 \cdot 130$ $\qquad$ $(225\,657 + 183\,495) : 4$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 101

1. Вылічы.

365 · 100	8500 : 100	9300 : 300
1949 · 100	90 000 : 1000	3800 : 200

2. На малочнай ферме надаілі за дзень 1680 кг малака. Адну восьмую ўсяго малака перапрацавалі на смятану, адну трэць смятаны — на масла. Колькі кілаграмаў малака перапрацавалі на масла?

3. Вылічы.

5 м 46 см · 3	3 т 78 кг : 6
3 кг 854 г · 8	1 дм 6 см : 8
9 км 769 м · 4	18 см 9 мм : 9
2 ц 17 кг · 4	34 ц 5 кг : 5

4. Даўжыня прамавугольніка $ABCD$ складае 8 см, а шырыня — 4 см. Начарці прамавугольнік, плошча якога складае $\frac{1}{2}$ плошчы прамавугольніка $ABCD$; $\frac{1}{4}$ плошчы прамавугольніка $ABCD$.

5. На ўваход вылічальнай машыны падалі лік 12 000. Які лік атрымаўся на выхадзе?

6. Складзі прыклад з лікаў 24, 6, 9, 270 па схеме.

□ : □ − □ = □



Правообладатель Пачатковая школа

7*. У буфеце ў чарзе стаяць Маша, Юля, Валя, Света, Алеся. Юля стаіць перад Машай, але пасля Алесі. Валя і Алеся не стаяць побач, а Света не знаходзіцца побач ні з Алесяй, ні з Юляй, ні з Валяй. У якім парадку стаяць дзяўчынкі?

8. Якія лічбы заменены зорачкамі?

$$\begin{array}{r|l} 2{*}{*}{*} & 8 \\ \cline{2-2} {*}{*} & {*}{*}0 \\ \cline{1-1} -\,{*}8 & \\ \cline{1-1} {*}8 & \\ \cline{1-1} 0 & \end{array} \qquad \begin{array}{r|l} 38{*}{*}{*} & 5 \\ \cline{2-2} {*}{*} & {*}{*}{*}{*} \\ \cline{1-1} -\,3{*} & \\ \cline{1-1} {*}5 & \\ \cline{1-1} 0 & \end{array}$$

9. З Магілёва ў Мінск адначасова выехалі аўтобус і маршрутнае таксі. Скорасць аўтобуса 60 км/г, а скорасць маршрутнага таксі на 40 км/г большая. Якая адлегласць будзе паміж імі праз 2 г?



10. У Мішы і Сашы разам 100 марак. Міша на дзень нараджэння падараваў Сашу 20 марак, пасля чаго марак у хлопчыкаў стала пароўну. Колькі марак было ў Мішы і колькі ў Сашы спачатку?

11. Вылічы.

42 259 : 7 590 003 − 8647 2540 · 30

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 102

168 : 40 = □

У дзелі будзе адна лічба.

Каб падабраць лічбу дзелі, закрываю ў дзельніку і ў дзялімым справа адну лічбу.

Дзялю: 16 : 4, пробная лічба — 4.

Правяраю пробную лічбу.

Множу: 4 · 40 = 160.

Аднімаю: 168 − 160 = 8.

Параўноўваю: 8 < 40.

Адказ: 168 : 40 = 4 (аст. 8).

$$\begin{array}{r|l} 168 & 40 \\ \underline{160} & 4 \\ 8 & \end{array}$$

1. Вылічы.

135 : 90	488 : 50	854 : 90	132 : 60
291 : 70	609 : 80	722 : 80	352 : 70

2. На першай ферме 112 кароў, а на другой — 102 каровы. Пры аднолькавай норме расходу сена на другой ферме за дзень расходуецца на 160 кг сена менш, чым на першай. Колькі сена расходуюць за дзень на кожнай ферме на адну карову?

3. Плошча прамавугольніка 400 см^2. Чаму роўная $\frac{1}{5}$ плошчы прамавугольніка?

4. Перыметр стадыёна прамавугольнай формы роўны 1 км. Даўжыня стадыёна 400 м. Знайдзі яго плошчу.

Правообладатель Пачатковая школа

5. Параўнай без вылічэнняў.

$64 \cdot 12 + 12 \cdot 36 * (64 + 35) \cdot 12$

$250 \cdot 12 * 250 \cdot 2 \cdot 10$

6*. З дзевяці аднолькавых кілаграмовых гір адна бракаваная — яна лягчэйшая за кілаграм. Як знайсці гэтую гіру пры дапамозе рычажных вагаў за два ўзважванні?

7. На ўваход вылічальнай машыны пададзены лікі: 10; 100; 1000; 10 000; 100 000. Якія лікі атрымаюцца на выхадзе?



8. Рашы ўраўненні.

$a \cdot 7 = 211\,918$ $\quad$ $161\,144 : x = 4$ $\quad$ $x \cdot 3 = 2703$

9. Колькі ўсяго адзінак кожнага разраду змяшчае лік 269 354? Колькі ўсяго дзясяткаў змяшчае лік 40 037?

10. Гаспадарка сабрала 38 946 кг сліў, чарэшань і вішань. Палову гэтай колькасці складалі слівы. Чарэшань было ў 3 разы менш, чым сліў, астатнія — вішні. Колькі кілаграмаў вішань сабрала гаспадарка?

11. Выканай дзяленне з астачай.

245 : 50	580 : 60	220 : 30
392 : 70	700 : 80	620 : 70

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 103

24 780 : 30 = □

Першае няпоўнае дзялімае: 247 сот.

У дзелі будзе тры лічбы.

Дзялю: 247 : 30.

Зручна: 24 : 3, пробная лічба — 8.

Множу: 8 · 30 = 240 (сот.).

Аднімаю: 247 − 240 = 7 (сот.).

Параўноўваю: 7 < 30.

$$\begin{array}{r|l} 24780 & 30 \\ \underline{240} & \overline{826} \\ 78 & \\ \underline{60} & \\ 180 & \\ \underline{180} & \\ 0 & \end{array}$$

Другое няпоўнае дзялімае: 78 дзяс.

Дзялю: 78 : 30.

Зручна: 7 : 3, пробная лічба — 2.

Множу: 2 · 30 = 60 (дзяс.).

Аднімаю: 78 − 60 = 18 (дзяс.).

Параўноўваю: 18 < 30.

Трэцяе няпоўнае дзялімае: 180 адз.

Дзялю: 180 : 30.

Зручна: 18 : 3, пробная лічба — 6.

Множу: 6 · 30 = 180 (адз.).

Аднімаю: 180 − 180 = 0.

Адказ: 826.

1. Вылічы.

29 340 : 60	31 280 : 80	124 040 : 70
43 650 : 50	57 680 : 80	103 230 : 90

2. На 70 км шляху аўтамабіль расходаваў 7 л бензіну. Колькі бензіну ён расходуе на 210 км шляху?

Правообладатель Пачатковая школа

3. З аднаго горада ў другі, адлегласць паміж якімі 300 км, выехаў аўтамабіль са скорасцю 60 км/г. Зваротная дарога заняла ў яго на 1 г менш. З якой скорасцю аўтамабіль ехаў назад?

4. Даўжыня прамавугольніка 12 см, а шырыня складае адну трэць яго даўжыні. Знайдзі перыметр і плошчу прамавугольніка.

5*. У трох каробках было 135 алоўкаў. Калі з першай каробкі ўзялі 15 алоўкаў, то ва ўсіх каробках алоўкаў стала пароўну. Колькі алоўкаў было ў першай каробцы?



6. Павяліч у 5 разоў.

2 кг 350 г; 7 т 105 кг; 108 дм 3 см; 3 м 5 мм.

7. Параўнай без вылічэнняў.

376 · 52 + 376 · 18 * 376 · 47 + 376 · 13
47 · 563 + 12 · 563 * 40 · 563 + 563 · 9

8. За адзін рэйс два аўтамабілі перавезлі разам 5500 кг грузу. Які груз перавёз кожны аўтамабіль, калі на адзін з іх пагрузілі на 500 кг больш, чым на другі?

9. Вылічы.

485 640 : 90 + 2978 378 · 70
456 · 20 + 12 800 : 40 7255 · 60

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 104

37 500 : 500 = □

Першае няпоўнае дзялімае: 3750 дзяс.
У дзелі будзе дзве лічбы.

```
 37500 | 500
-3500  |  75
 2500
-2500
    0
```

Дзялю: 3750 : 500.
Зручна: 37 : 5, пробная лічба — 7.
Множу: 7 · 500 = 3500 (дзяс.).
Аднімаю: 3750 − 3500 = 250 (дзяс.).

Другое няпоўнае дзялімае: 250 дзяс. = 2500 адз.
Дзялю: 2500 : 500.
Зручна: 25 : 5, пробная лічба — 5.
Множу: 5 · 500 = 2500 (адз.).

Адказ: 75.

1. Вылічы.

1800 : 300	4000 : 800	45 000 : 5000
4500 : 500	2100 : 700	48 000 : 3000
4900 : 700	2400 : 300	42 000 : 6000

2. Перыметры квадрата і прамавугольніка аднолькавыя. Стораны прамавугольніка 8 м і 12 м. Чаму роўная плошча квадрата?

3. Пяць трохтонных аўтамабіляў перавезлі 90 т бульбы, зрабіўшы аднолькавую колькасць рэйсаў. Колькі рэйсаў зрабіў кожны аўтамабіль? Рашы рознымі спосабамі.

Правообладатель Пачатковая школа

4. З населенага пункта ў адным напрамку адначасова выйшлі два пешаходы, адзін са скорасцю 3 км/г, другі са скорасцю 5 км/г. Запішы выразы для знаходжання адлегласці паміж пешаходамі праз t гадзін.

5.

4050 см * 4 м 50 см	4700 дм * 40 дм 7 см
2 км 3 м * 2 км 3 дм	70 м 8 дм * 708 дм
4 т 70 ц * 4700 кг	19 ц 53 кг * 195 т

6*. Калі сшыткі, што ляжаць у стосе, раздаць па 2 кожнаму вучню класа, то ў стосе застанецца 7 сшыткаў. Калі ж кожнаму вучню раздаць па 3 сшыткі, то 5 вучняў нічога не атрымаюць. Колькі вучняў у класе?

7. Вылічы.

45 дм 60 см + 87 дм 75 см	39 ц 57 кг − 28 ц 64 кг
327 км 40 м − 148 км 824 м	5 т 423 кг + 2 т 287 кг

8. Са стальной пласціны плошчай 400 см^2 можна зрабіць 4 загатоўкі. Колькі такіх загатовак можна зрабіць з пласціны плошчай 36 дм^2?

9. Паменшы:

а) 4500 у 10 разоў, у 100 разоў;
б) 604 000 у 10 разоў, у 100 разоў, у 1000 разоў.

10. Адлегласць паміж гарадамі 288 км. Аўтамабіль праехаў яе за 4 г, а матацыкл — за 6 г. На колькі скорасць матацыкла меншая за скорасць аўтамабіля?

11. Вылічы і правер.

720 : 80	320 : 40	6000 : 500	3120 : 40

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 105

1. Вылічы.

1680 : 30	47 360 : 80	218 500 : 500
3040 : 40	33 210 : 90	71 400 : 300

2. Майстар за гадзіну вырабляе 10 дэталяў, а яго вучань — 5 дэталяў. За які час кожны з іх можа вырабіць 90 дэталяў?

3. Колькі трохвугольнікаў на рысунку? Запішы назвы трохвугольнікаў, якія змяшчаюць вугал A. Якія гэта трохвугольнікі?



4. Выразі:

а) у метрах — 12 км; 7 км 250 м; 8500 дм; 67 000 см;
б) у кілаграмах — 19 т; 51 ц; 3 т 8 ц; 7 т 160 кг;
в) у гадзінах — 7 сут; 2 сут 15 г; 180 мін; 420 мін.

5*. Падстаў замест * знакі арыфметычных дзеянняў так, каб роўнасці былі правільныя.

37 000 * 10 * 300 = 4000
2600 * 100 * 1300 * 2 = 100

6. Запішы няроўнасці. Ці правільныя яны?

а) Дзель лікаў 7851 і 3 меншая за іх рознасць.
б) Дзель лікаў 7851 і 1 большая за іх рознасць.
в) Здабытак лікаў 3806 і 5 большы за іх суму.

Правообладатель Пачатковая школа

7. Два аўтамабілі выехалі з пункта A у адным напрамку. Першы выехаў на 2 г раней і рухаўся са скорасцю 75 км/г. Другі аўтамабіль рухаўся са скорасцю 90 км/г. Праз колькі гадзін другі аўтамабіль дагоніць першы? На якой адлегласці ад пункта A?

8. Складзі па схеме выраз і знайдзі яго значэнне.



9. Знайдзі: $\frac{1}{3}$ ліку 2481; $\frac{1}{6}$ ліку 34 260; $\frac{1}{7}$ ліку 1085; $\frac{1}{9}$ ліку 20 340.

10. Складзі задачу па табліцы. Рашэнне запішы з дапамогай выразу.

Скорасць	Час	Адлегласць
аднолькавая	5 г	300 км
	8 г	?

11. Знайдзі значэнні выразаў.

200 930 – 6703 · 4 (26 270 + 730 · 2) · 10
305 979 + 54 243 : 9 (2058 : 7 + 306) · 5

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 106

1. Вучні купілі тры аднолькавыя сшыткі і заплацілі 54 к. Колькі такіх сшыткаў можна купіць на 72 к.?

54 к.

2. Вылічы зручным спосабам.

360 : (18 · 5)	4200 : (100 · 3)
750 : (25 · 3)	510 : (3 · 10)
560 : (8 · 5)	840 : (5 · 7)

3. У аптэцы расклалі 5 кг 600 г сушаных чарніц у пачкі па 70 г. Колькі пачкаў атрымалася?

4.

5 г * 300 мін	5800 кг * 58 т
205 мм * 20 дм	9 км * 9050 дм
5 га * 5000 м^2	7 дм^2 5 см^2 * 75 000 см^2

5. Хлопчык быў на катку з 15 г 30 мін да 19 г. Колькі часу ён быў на катку?

6. У адным меху 50 кг бульбы. Колькі такіх мяхоў спатрэбіцца, каб раскласці 1 ц бульбы; 1 т бульбы?

7. На колькі трэба памножыць лік 75, каб атрымаўся лік, у якім столькі ж адзінак другога класа, а адзінкі першага класа адсутнічаюць?

Правообладатель Пачатковая школа

8*. Якія лічбы заменены зорачкамі? Выканай праверку.

```
 **48 | 6
-**    |----
 ---  | 2**
 -3*
  **
  ---
  -**
   **
   --
    0
```

```
 ****  | 7
-*1    |----
 ---   | ***
  -**
   5*
   --
    0
```

9. Вылічы.

(27 989 + 40 632 : 8) · 4
(1200 – 200 · 3) : 2

404 000 – 17 872 : 2
(1800 – 800 · 2) : 4

10. Начарці дзве акружнасці радыусам 3 см, каб яны перасякаліся. Адзнач пункты, якія належаць абедзвюм акружнасцям. Колькі іх? Адзнач пункт, які ляжыць унутры абедзвюх акружнасцей. Колькі такіх пунктаў?

11. На фабрыцы пашылі 56 куртак для дзяўчынак і 75 куртак для хлопчыкаў. Расход тканіны на кожную куртку быў аднолькавы. Пры гэтым на курткі для хлопчыкаў спатрэбілася на 57 м тканіны больш, чым на курткі для дзяўчынак. Колькі тканіны пайшло на курткі для дзяўчынак? Для хлопчыкаў?

12. Знайдзі значэнні выразаў.

707 897 + 36 864 : 8
(170 560 – 560 · 2) : 10

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 107

57 · 34 = □

57 · 34 = 57 · (30 + 4) = 57 · 30 + 57 · 4 =
= 1710 + 228 = 1938

Множу лік 57 на 4 адзінкі.
228 — першы няпоўны здабытак.
Пачынаю пісаць пад адзінкамі.

Множу лік 57 на 3 дзясяткі.
171 — другі няпоўны здабытак.
Пачынаю пісаць пад дзясяткамі.

Складваю няпоўныя здабыткі.
Поўны здабытак лікаў 57 і 34 роўны 1938.

$$\begin{array}{r} 57 \\ \times\ 34 \\ \hline 228 \\ +\ 171 \\ \hline 1938 \end{array}$$

1. Вылічы.

24 · 75	17 · 49	85 · 26	99 · 19
15 · 18	29 · 93	91 · 19	79 · 24

2. З двух пасёлкаў, адлегласць паміж якімі 135 км, адначасова насустрач адна адной выехалі дзве групы веласіпедыстаў. Першая група ехала са скорасцю 12 км/г, а другая — са скорасцю 15 км/г. Праз колькі гадзін яны сустрэнуцца?

Правообладатель Пачатковая школа

3*. Першы лік большы за другі на 229, а яго палова на 187 меншая за другі лік. Знайдзі гэтыя лікі?

4. Начарці розныя прамавугольнікі з перыметрам 16 см і знайдзі іх плошчу. У якога прамавугольніка найбольшая плошча?

5. Вылічы.

540 · 200 − 5280 : 40	(512 237 − 140 037) : 40
65 430 : 90 + 73 · 500	60 · (100 100 − 98 700)

6. Размясці хлопчыкаў у такім парадку, каб лічбы на іх адзенні ўтварылі лік, які без астачы дзеліцца на 8.

7. Знайдзі прапушчаныя лікі.

1 дм^2 меншы за 1 м^2 на ☐ дм^2.

16 ц меншыя за 16 т на ☐ ц.

7 см меншыя за 7 дм у ☐ разоў.

8. Аўтобус за 6 г праехаў 300 км. Якую адлегласць праедзе за гэты час аўтамабіль, калі яго скорасць на 10 км/г большая за скорасць аўтобуса?

9. Вылічы.

42 · 27	75 · 34	94 · 19	32 · 46
89 · 41	83 · 56	23 · 54	72 · 33

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 108

5800 · 26 = □

5800 · 26 = (58 · 100) · 26 = (58 · 26) · 100 =
= 1508 · 100 = 150 800

5800 · 26 = 58 сот. · 26 = 1508 сот. = 150 800

Множу лік 58 на 6 адзінак.
Першы няпоўны здабытак 348 пачынаю запісваць справа пад адзінкамі.

Множу лік 58 на 2 дзясяткі.
Другі няпоўны здабытак 116 пачынаю запісваць справа пад дзясяткамі.

$$\begin{array}{r} 5800 \\ \times\ 26 \\ \hline 348 \\ +\ 116 \\ \hline 150800 \end{array}$$

Складваю няпоўныя здабыткі.
Поўны здабытак роўны: 1508 · 100 = 1508 сот. = 150 800

1. Вылічы.

7200 · 21	1700 · 28	530 · 34
6560 · 42	260 · 44	6700 · 81

2. На першай ферме авечкам выдавалі на дзень 420 кг сена, а на другой ферме — 375 кг. На першай ферме авечак было на 15 больш, чым на другой. Колькі авечак было на кожнай ферме, калі норма выдачы сена на адну авечку ў дзень аднолькавая?

	Норма на адну авечку	Колькасць авечак	Агульная маса сена
I	аднолькавая	?, на 15 больш	420 кг
II		?	375 кг

Правообладатель Пачатковая школа

3. Вылічы.

8 т 99 кг · 37	38 дм 7 см · 28
24 ц 35 кг · 86	93 см · 34

4. Знайдзі значэнне выразу 75 · b, калі b = 100; 12; 35.

5*. Маса двух яблыкаў 200 г. Знайдзі масу вялікага яблыка.



6.

5 км 240 м * 524 м	25 кг 300 г * 7500 г
4321 см * 43 м 21 см	7910 ц * 79 т 1 ц
25 сут * 250 г	3600 с * 6 мін

7. Перыметр прамавугольніка роўны 1 дм 2 см, даўжыня — 40 мм. Начарці гэты прамавугольнік і вылічы яго плошчу.

8. Як зменіцца здабытак, калі:

а) значэнне аднаго множніка павялічыць у 6 разоў, а значэнне другога паменшыць у 3 разы?

б) значэнне аднаго множніка павялічыць у 3 разы, а значэнне другога паменшыць у 6 разоў?

9. Каб пасеяць грэчку на плошчы 1 м^2, трэба 15 г насення. Колькі грамаў насення грэчкі неабходна, каб засеяць поле плошчай 75 м^2; 84 м^2?

10. Вылічы.

960 · 63	8300 · 75	5300 · 69
603 · 48	4200 · 27	6300 · 35

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 109

1. Растлумач множанне.

5316 · 11 = ☐



$$\begin{array}{r} 5316 \\ \times\ \ 11 \\ \hline 5316 \\ +\ 5316 \\ \hline 58476 \end{array}$$

2. Вылічы рознымі спосабамі.

25 · 11 236 · 11 3245 · 11 4236 · 11

3. Памідоры раскладвалі ў аднолькавыя скрыні. У сямі скрынях умяшчаецца на 32 кг памідораў больш, чым у трох скрынях. На базе знаходзіцца 120 скрынь. Ці хопіць гэтых скрынь для ўкладкі 872 кг памідораў?



4. Квадрат мае такі самы перыметр, што і прамавугольнік, даўжыня якога 120 см, а шырыня — у 4 разы меншая. Знайдзі старану квадрата. Вылічы яго плошчу.

5*. Якой лічбай заканчваецца здабытак усіх адназначных лікаў, акрамя нуля?

Правообладатель Пачатковая школа

6. Вылічы.

9 м : 4	4 км : 5	9 ц : 2	36 т : 6
15 м : 6	3 км : 2	7 ц : 5	48 т : 8
13 м : 5	7 км : 4	9 ц : 6	72 т : 9

7. Пеця і Вася адначасова паплылі насустрач адзін аднаму з двух бакоў басейна, даўжыня якога 120 м. Пеця плыў са скорасцю 25 м/мін, Вася — са скорасцю 35 м/мін. Якую адлегласць праплыў кожны з іх да сустрэчы?



8. Вылічы.

7500 : 100	(540 + 60) : 10
5650 : 10 · 100	90 · 10 : 100
3 · 100 : 10	50 · 100 : 10

9. Запішы лікі: 5442; 46 020; 370 743. Колькі ў кожным з гэтых лікаў усяго дзясяткаў? Усяго сотняў?

10. У некалькі школьных буфетаў завезлі 750 пакетаў кефіру і малака. Кожная школа атрымала 25 пакетаў кефіру, а малака — у 5 разоў больш, чым кефіру. У колькі школ завезлі малако і кефір?

11. Рашы ўраўненні.

$x : 35 = 364$	$k \cdot 2 = 3000 - 288$
$y : 24 = 276$	$b : 2 = 400 \cdot 21$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 110

1. У Мішы і Пеці была аднолькавая колькасць грошай. Міша купіў на ўсе грошы 4 паветраныя шары па цане 25 к. Пеця купіў на ўсе грошы некалькі паштовак па цане 50 к. Колькі паштовак купіў Пеця? Рашы задачу двума спосабамі.

2. Вылічы.

230 · 27	3900 · 46	5600 · 25
22 260 : 70	32 200 : 700	50 400 : 600

3. На сцежку ў садзе даўжынёй 10 м і шырынёй 50 см паклалі квадратную плітку. Старана кожнай пліткі 25 см. Колькі плітак спатрэбілася?



4. Рашы ўраўненні.

$x \cdot 36 = 240 + 480$ $\qquad$ $72 : x = 680 - 644$

5. $\geqslant =$

2 км 23 м * 20 230 см
42 ц 9 кг * 4 т 290 кг
40 мін 27 с * 2403 с
58 дм 7 см * 50 дм 78 см

6. Якія з адзначаных пунктаў належаць квадрату? Акружнасці? Кругу? Квадрату, але не кругу? Квадрату і кругу? Кругу, але не квадрату?



Правообладатель Пачатковая школа

7*. У Косці было на $\frac{1}{3}$ цукерак больш, чым у Юры. Калі Косця аддаў сястры 300 г цукерак, то ў хлопчыкаў стала цукерак пароўну. Колькі грамаў цукерак было ў кожнага хлопчыка спачатку?



8. Алесь спазніўся на дзень нараджэння сябра на 600 с. Зараз 13 г 10 мін. На які час былі запрошаны госці?

9. Не выконваючы дзялення знайдзі, колькі лічбаў атрымаецца ў дзелі ад дзялення 8728 на 4; 1278 на 6.

10. Да прыпынку машына ехала 4 г са скорасцю 74 км/г, а пасля прыпынку — 2 г са скорасцю, меншай на 10 км/г. Якую адлегласць праехала машына?



11. Вылічы.

7035 · 4 − 10 000	5505 : 5 + 99
32 200 : 70 + 695	2040 : 6 + 2829

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 111

672 · 423 = □

672 · 423 = 672 · (400 + 20 + 3) =
= 672 · 400 + 672 · 20 + 672 · 3 =
= 268 800 + 13 440 + 2016 = 284 256

Множу лік 672 на 3 адзінкі.
Першы няпоўны здабытак 2016 пачынаю пісаць пад адзінкамі.

Множу лік 672 на 2 дзясяткі.
Другі няпоўны здабытак 1344 пачынаю пісаць пад дзясяткамі.

Множу лік 672 на 4 сотні.
Трэці няпоўны здабытак 2688 пачынаю пісаць пад сотнямі.

$$\begin{array}{r} 672 \\ \times\ 423 \\ \hline 2016 \\ +1344 \\ \hline 2688 \\ \hline 284256 \end{array}$$

Складваю няпоўныя здабыткі.
Поўны здабытак лікаў 672 і 423 роўны 284 256.

1. Вылічы.

286 · 364	358 · 532	788 · 637	753 · 462
568 · 137	625 · 278	849 · 567	687 · 394

2. Першы мастак размаляваў 96 збаноў, а другі — 64 такія ж збаны. Другі мастак працаваў на 2 дні менш, чым першы. Колькі дзён працаваў кожны мастак, калі за дзень яны размалёўвалі аднолькавую колькасць збаноў?

3. Рашы ўраўненні.

45 025 + x = 641 · 100 725 − x = 43 500 : 100

Правообладатель Пачатковая школа

4. Параўнай два прамавугольнікі са старанамі 8 см і 6 см, 4 см і 12 см. Які з іх большы па перыметры? Па плошчы? На колькі?

5. Маса яблыкаў на шалях 600 г. Знайдзі масу меншага яблыка.



6. Запішы тры правільныя няроўнасці з велічынь: 6 км; 8 сут; 8000 дм^2; 80 т; 81 ц; 60 000 м; 102 г.

7. Колькі лічбаў будзе ў дзелі?

5628 : 2 56 020 : 20 9640 : 40 3015 : 15

8*. Андрэй сказаў Сяргею: «Калі б у мяне было на 3 маркі больш, чым цяпер, то я меў бы марак у 2 разы больш, чым ты». Колькі марак у кожнага з хлопчыкаў, калі разам у іх 15 марак?

9. Каб пафарбаваць грузавы аўтамабіль, патрабуецца 1 кг 750 г фарбы, а каб пафарбаваць прычэп — 1 кг 350 г. Колькі фарбы расходуецца за дзень на заводзе на афарбоўку аўтамабіляў і прычэпаў, калі штодзённа завод выпускае 60 аўтамабіляў з прычэпамі?

10. Вылічы.

7084 · 34	12 135 · 54	39 687 · 33
7653 · 11	81 368 · 49	14 090 · 76

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 112

473 · 305 = □

473 · 305 = 473 · (300 + 5) = 473 · 300 + 473 · 5 =
= 141 900 + 2365 = 144 265

Множу лік 473 на 5 адзінак.
Першы няпоўны здабытак 2365.
Пачынаю пісаць пад адзінкамі.
Множу лік 473 на дзясяткі.
Атрымліваю другі няпоўны здабытак 0.
Яго можна не пісаць.
Множу лік 473 на 3 сотні.
Трэці няпоўны здабытак 1419 пачынаю пісаць пад сотнямі.
Складваю няпоўныя здабыткі.
Лік 144 265 — здабытак лікаў 473 і 305.

```
  473
× 305
 2365
+ 000
 1419
144265
```

```
  473
× 305
 2365
+1419
144265
```

1. Вылічы.

675 · 307	363 · 708	203 · 406	358 · 701
232 · 403	584 · 903	748 · 805	902 · 604

2. Вуліцу даўжынёй 800 м і шырынёй 13 м трэба заасфальтаваць. На кожныя 100 м^2 пакрыцця неабходна 3 т 850 кг асфальту. Колькі спатрэбіцца асфальту, каб заасфальтаваць усю вуліцу?

3. Які лік атрымаецца, калі:

а) здабытак лікаў 30 і 45 паменшыць у 15 разоў?
б) здабытак лікаў 75 і 22 паменшыць у 11 разоў?

Правообладатель Пачатковая школа

4. Знайдзі лікі на выхадзе вылічальнай машыны.



5*. Калі на кожную паліцу паставіць 30 кніг, то застанецца 10 кніг, а калі на кожную паліцу паставіць 25 кніг, то застанецца 50 кніг. Колькі ўсяго паліц?

6. Знайдзі прапушчаныя лікі.

15 дм² = ☐ см² 20 м² = ☐ дм²

52 м² = ☐ дм² 2 га = ☐ м²

3700 см² = ☐ дм² 15 м² = ☐ см²

7. Шырыня прамавугольнай пляцоўкі 30 м. Чаму роўны перыметр пляцоўкі, калі яе плошча 2400 м²?

8. У першы дзень прывезлі бульбу на 10 машынах па 4 т 200 кг на кожнай, у другі дзень — на 7 машынах па 4 т 600 кг на кожнай. На колькі больш бульбы прывезлі ў першы дзень, чым у другі?

9. Вылічы.

573 · 205 201 · 506 450 : 90

674 · 304 702 · 402 5800 : 200

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 113

Растлумач парадак дзеянняў у выразах, якія ўтрымліваюць дзве пары дужак.

$$(350 \overset{1}{+} 150) \overset{3}{\cdot} (430 \overset{2}{-} 400) \overset{4}{+} 20 = 15\,020$$

$$(8000 \overset{1}{:} 4 \overset{2}{+} 500) \overset{4}{\cdot} (104 \overset{3}{-} 100) = 10\,000$$

1. Адзнач парадак дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

$6 \cdot (2138 - 1674) - (2201 - 1903)$

$(918 + 1530) : (12 \cdot 6 - 63)$

$5468 - (368 \cdot 5 - 368 \cdot 4)$

2. Матацыкл выехаў з горада ў 8 г са скорасцю 50 км/г. У 9 г за ім выехаў аўтамабіль са скорасцю 75 км/г. Праз колькі часу пасля пачатку руху аўтамабіль дагоніць матацыкл?

8 г

9 г

3. Жоўтагаловы каралёк — самая малая з птушак, што гняздуюць у Беларусі. Маса яе цела складае $\frac{1}{200}$ ад 1 кг. Чаму роўная маса цела гэтай птушкі?

Правообладатель Пачатковая школа

4. Рашы ўраўненні.

$a \cdot 3 = 3192 + 3708$ $\qquad$ $6 \cdot k = 822$

5*. Адзін слоік змяшчае 3 л вады, а другі — 5 л. Як пры дапамозе гэтых слоікаў наліць у бітон 4 л вады з водаправоднага крана?

6. Шырыня ўчастка прамавугольнай формы 6 м. Знайдзі $\frac{1}{3}$ перыметра ўчастка, калі яго плошча 720 м^2.

7.

8000 м^2 * 8 га $\qquad$ 5 м^2 6 дм^2 * 506 дм^2

10 га * 1000 м^2 $\qquad$ 7 дм^2 7 см^2 * 7007 см^2

5 га * 50 000 м^2 $\qquad$ 9 дм^2 5 см^2 * 9050 см^2

8. Запішы лікі сумамі разрадных складаемых.

7006 $\qquad$ 38 009 $\qquad$ 610 061 $\qquad$ 806 086

9. За першы дзень у магазіне прадалі 320 кг цукру. За другі дзень — у 4 разы менш, чым за першы. За трэці — столькі, колькі за першыя два дні разам. Колькі кілаграмаў цукру прадалі за трэці дзень?

10. Знайдзі.

$\frac{1}{4}$ ліку 9600 $\qquad$ $\frac{1}{10}$ ліку 1000

$\frac{1}{5}$ ліку 650 $\qquad$ $\frac{1}{3}$ ліку 7200

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 114

1. Для запраўкі двух аўтобусаў было атрымана 2160 л бензіну. Адзін аўтобус выпрацаваў сваю частку бензіну за 72 г, а другі — за 48 г. Колькі бензіну было атрымана для запраўкі кожнага аўтобуса, калі расход бензіну за гадзіну ў іх быў аднолькавы?

2. Вылічы.

125 · 342	305 · 421	865 · 300
434 · 256	241 · 104	725 · 200
254 · 102	154 · 204	402 · 120

3. Выканай дзеянні.

3 т − 7 ц	470 кг + 800 кг
2 г + 115 мін	2 сут − 34 г
3 мін − 50 с	2 м − 540 мм
7 дм − 6 см	3 ц + 120 кг

4*. Сума трох лікаў, што ідуць адзін за адным, роўная 105. Знайдзі гэтыя лікі.

5. Выкарыстаўшы схемы, запішы выразы, у якіх:
$a = 28 \cdot 370$, $b = 35\,778$, $c = 782$.



Правообладатель Пачатковая школа

6. Якія вуглы паказаны на рысунку? Правер з дапамогай навугольніка.

а) б) в) г)

7. Спрасці дзеянні ў вылічальных машынах. Выкарыстай узор.



а) б) в) г) д)

8. У цыстэрне 60 т нафты. Спачатку з яе ўзялі $\frac{1}{5}$ усёй нафты, а затым — $\frac{1}{4}$ астачы. Колькі тон нафты засталося пасля гэтага ў цыстэрне?

9. Вылічы.

(15 + 25) · 17 − 433 17 108 : (119 − 735 : 7)

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 115

828 : 92 = □

У дзелі будзе адна лічба (8 < 92, 82 < 92).
Закрываю справа ў дзельніку і дзялімым па адной лічбе.

Дзялю: 82 : 9, пробная лічба — 9.
Множу: 9 · 92 = 828.
Аднімаю: 828 − 828 = 0.
Астачы няма. Лічба 9 падыходзіць.

828	92
828	9
0	

168 : 28 = □

У дзелі будзе адна лічба (1 < 28, 16 < 28).
Закрываю справа ў дзельніку і дзялімым па адной лічбе.
Дзялю: 16 : 2, пробная лічба — 8.
Множу: 8 · 28 = 224, 224 > 168.
Лічба 8 не падыходзіць.
Паспрабую лічбу 7.
Множу: 7 · 28 = 196, 196 > 168.
Лічба 7 не падыходзіць.
Паспрабую лічбу 6.
Множу: 6 · 28 = 168.
Лічба 6 падыходзіць.

168	28
168	6
0	

1. Вылічы.

355 : 71	146 : 73	195 : 65
584 : 73	352 : 44	360 : 72

Правообладатель Пачатковая школа

2. Вучні сабралі 1540 кг бульбы, прычым 12 вучняў сабралі па 75 кг бульбы кожны, а ўсе астатнія — па 80 кг. Колькі ўсяго школьнікаў збіралі бульбу?

3. Першы лік a, другі — b, а трэці — у 6 разоў большы за дзель двух першых лікаў. Знайдзі трэці лік, калі $a = 300$, $b = 10$.

4. Запоўні пропускі.

2 мін = ☐ с	1 сут = ☐ мін	3 сут = ☐ г
1 г = ☐ с	1 тыдзень = ☐ г	20 сут = ☐ г

5*. На дзвюх паліцах было па 32 кнігі на кожнай. З першай паліцы ўзялі некалькі кніг, а з другой узялі столькі, колькі засталося на першай паліцы. Колькі кніг засталося на дзвюх паліцах?

6. Перыметр прамавугольніка 36 см, даўжыня адной з яго старон 8 см. Знайдзі плошчу прамавугольніка.

7. Два хлопчыкі ішлі насустрач адзін аднаму з аднолькавай скорасцю. Адзін да сустрэчы ішоў 5 мін і прайшоў на 130 м больш за другога, які быў у дарозе 3 мін. Якая адлегласць была паміж хлопчыкамі спачатку?



8. Вылічы.

427 : 61	246 : 82	378 : 54	432 : 72
216 : 27	456 : 57	190 : 38	185 : 37

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 116

270 : 52 = □

У дзелі будзе адна лічба.
Дзялю: 27 : 5,
пробная лічба — 5.
Множу: 5 · 52 = 260.

270	52
260	5
10	

Аднімаю: 270 − 260 = 10. Параўноўваю: 10 < 52.
Лічба 5 падабрана правільна.
Адказ: 270 : 52 = 5 (аст. 10).

1. Знайдзі дзелі і астачы.

623 : 76	146 : 34	280 : 45
460 : 74	540 : 67	361 : 47
515 : 57	603 : 72	468 : 48

2. Два аўтобусы перавезлі 490 пасажыраў, зрабіўшы аднолькавую колькасць рэйсаў. Колькі пасажыраў перавёз кожны аўтобус, калі адзін аўтобус за рэйс перавозіў 25 чалавек, а другі — 45 чалавек?

	За адзін рэйс	Колькасць рэйсаў	Усяго пасажыраў
I	25 чал.	аднолькавая	? } 490 чал.
II	45 чал.		?

Правообладатель Пачатковая школа

3. Выразі:

а) у метрах — 6 км; 3 км 700 м; 840 дм; 500 см;
б) у кілаграмах — 8 т; 7 т 7 ц; 600 ц; 4000 г;
в) у секундах — 3 мін; 2 мін 45 с; 4 мін 20 с.

4*. Колькі зараз часу, калі частка сутак, што засталася, большая за мінулую ў 5 разоў? У 3 разы?

5. Плошча прамавугольніка 45 см^2, даўжыня — 30 мм. Начарці такі прамавугольнік і знайдзі яго перыметр.

6. Запішы ўраўненне і рашы яго:

а) дзель невядомага ліку і ліку 15 роўная 87;
б) калі задуманы лік падзяліць на 240, то атрымаецца 12.

7. Пастаў замест * знакі арыфметычных дзеянняў.

(17 * 7) : 5 = 2 40 − 10 * 2 = 20
(23 + 4) * 3 = 9 42 − 21 * 2 = 0

8. Адзін верталёт праляцеў 480 км, а другі — 800 км. Першы верталёт быў у палёце на 2 г менш, чым другі. Колькі гадзін быў у палёце кожны верталёт, калі іх скорасці былі аднолькавыя?



9. Вылічы.

544 : 68 + 329 : 47 513 : 57 + 91
216 : 36 + 594 : 66 752 : 94 + 82

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 117

364 : 26 = □

Першае няпоўнае дзялімае: 36 дзяс.
У дзелі будзе дзве лічбы (дзясяткі, адзінкі).
Дзялю: 36 : 26, пробная лічба — 1.
Множу: 1 · 26 = 26.
Аднімаю: 36 − 26 = 10.
Параўноўваю: 10 < 26.

−	364	26
	26	13
−	104	
	78	
	26	

Другое няпоўнае дзялімае:
10 дзяс. + 4 адз. = 104 адз.
Дзялю: 104 : 30.
Зручна: 10 : 3, пробная лічба — 3.
Множу: 3 · 26 = 78.
Аднімаю: 104 − 78 = 26.
Параўноўваю: 26 = 26.
Лічба 3 не падыходзіць.
Паспрабую лічбу 4: 4 · 26 = 104.
Адказ: 14.

−	364	26
	26	14
−	104	
	104	
	0	

1. Вылічы.

187 : 17	252 : 12	330 : 15	594 : 54
264 : 12	465 : 15	429 : 13	247 : 19

2. Даўжыня саду 30 м, а шырыня — 20 м. На адлегласці 3 м ад агароджы вакол саду пракладзена дарожка. Знайдзі яе даўжыню.



Правообладатель Пачатковая школа

3. На ферме за сезон настрыглі з авечак 10 620 кг белай воўны. Гэта ў 5 разоў больш, чым чорнай. Чацвёртую частку ўсёй воўны здалі на выраб валёнак. Колькі кілаграмаў воўны здалі на выраб валёнак?



4. Знайдзі прапушчаныя лікі.

3 т 5 ц = ☐ кг 49 ц = ☐ кг

1 дм² = ☐ см² 7 дм² = ☐ см²

5*. Запішы лік 100, выкарыстаўшы пяць разоў лічбу 5 і знакі арыфметычных дзеянняў.

6. Параўнай без вылічэнняў.

2400 : 10 : 2 * 2400 : (10 · 2)
1560 : 3 · 10 * 1560 : (3 · 10)
68 · 40 * 68 · (4 · 10)
54 · 50 * 54 · (10 : 5)

7. Калгас прадаў 364 т пшаніцы, жыта — на 76 т менш, чым пшаніцы, а грэчкі — у 16 разоў менш, чым жыта. Пастаў пытанні так, каб задача рашалася ў два дзеянні; у тры дзеянні.

8. Вылічы.

679 : 97	584 : 73	392 : 49
216 : 27	444 : 74	406 : 58

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 118

1. Вылічы.

387 : 43	(6351 – 5379) : 54
378 : 63	(8260 – 7924) : 56
430 : 86	(10 000 – 9335) : 95



2. Каб зашкліць вокны аднаго дома, спатрэбілася 486 лістоў шкла, а на вокны з такімі ж рамамі ў другім доме пайшло 432 лісты шкла. У другім доме на 9 вокнаў менш, чым у першым. Колькі ўсяго вокнаў зашклілі?

3. Знайдзі значэнне выразу $130 \cdot a$, калі $a = 30; 200; 100$.

4. Касманаўты былі ў палёце 290 г. Колькі гэта сутак і гадзін?

5*. Бацьку, дзеду і сыну разам 110 гадоў. Бацьку і дзеду разам 97 гадоў, а бацьку і сыну разам 51 год. Колькі гадоў дзеду, бацьку, сыну? На колькі гадоў дзед старэйшы за бацьку? На колькі гадоў бацька старэйшы за сына?



6. Прамавугольнік і квадрат маюць аднолькавую плошчу — 64 м^2. Чаму роўная даўжыня прамавугольніка, калі яго шырыня ў 2 разы меншая за старану квадрата?

Правообладатель Пачатковая школа

7. На 100 км аўтамабіль расходуе 8 л бензіну. Ці можна на гэтым аўтамабілі даехаць з Мінска да любога абласнога цэнтра і вярнуцца назад, зрасходаваўшы не больш за 60 л бензіну?

8. Назаві разрадныя складаемыя лікаў: 4520; 2645; 750; 7005; 4325.

9. Працягласць жыцця бярозы 150 гадоў, што ў 4 разы менш за працягласць жыцця дуба. На колькі дуб жыве даўжэй, чым бяроза?

10. Вылічы.

473 : 43	492 : 12	357 : 17	900 : 45
273 : 13	615 : 15	700 : 35	500 : 25

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 119

План выканання дзялення.

1. Вызначаю колькасць лічбаў у дзелі.
2. Першае няпоўнае дзялімае дзялю на дзельнік.
3. Правяраю першую пробную лічбу дзелі.
4. Утвараю другое няпоўнае дзялімае і дзялю яго на дзельнік.
5. Правяраю другую пробную лічбу дзелі.
6. Выконваю дзяленне, пакуль не раздзялю апошняе няпоўнае дзялімае (адзінкі).

$$\begin{array}{r|l} 33994 & 46 \\ \underline{322} & 739 \\ 179 & \\ \underline{138} & \\ 414 & \\ \underline{414} & \\ 0 & \end{array}$$

1. Вылічы.

18 900 : 25	11 088 : 12	58 734 : 39
11 610 : 18	254 306 : 26	239 685 : 15

2. У атэлье было 93 м тканіны. З яе пашылі 21 аднолькавую дзіцячую сукенку і 17 аднолькавых жаночых сукенак. Колькі тканіны пайшло на пашыў дзіцячай сукенкі, калі на жаночую сукенку трэба 3 м?

3. Начарці адрэзак AB даўжынёй 7 см. Адзнач на ім пункт C так, каб адрэзак AC быў карацейшы за адрэзак CB на 3 см.

Правообладатель Пачатковая школа

4. Складзі па схемах выразы і знайдзі іх значэнні.





5*. Маса пяці аднолькавых груш роўная 1 кг. Адну з груш замянілі яблыкам масай 250 г. Якой стала маса ўсіх фруктаў?



6. Выразі ў кілаграмах і грамах.

5007 г 12 120 г 2 т 350 г 27 ц 18 г

7. Рашы ўраўненні.

$50 \cdot x = 9052 + 8898$ $52\,013 : y = 13$

$y : 307 = 72\,593 - 72\,306$ $45\,015 : a = 15$

8. У дзве новыя школы было прынята 1687 вучняў. У адну школу прынялі 812 вучняў, у кожны клас па 28 вучняў. Астатнія вучні былі прыняты ў другую школу па 25 вучняў у клас. Колькі класаў у дзвюх школах разам?

9. Вылічы.

327 870 : 45	3456 : 54	17 696 : 28
193 089 : 13	20 026 : 34	3888 : 18

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 120

1. Для азелянення школьнага двара купілі саджанцы — 6 дрэў і 15 кустоў. Дрэва каштуе 8 р. 72 к., а цана куста ў 4 разы меншая. Колькі каштуюць усе саджанцы?

	Цана	Колькасць	Кошт
дрэва	8 р. 72 к.	6 шт.	? } ?
куст	?, у 4 разы меншая	15 шт.	? } ?

2. Выканай дзяленне і зрабі праверку.

2832 : 12	29 876 : 14	68 224 : 32
6071 : 13	71 130 : 30	30 452 : 23

3. Запішы лік, у якім:

а) 537 адзінак першага класа і 63 адзінкі другога класа;

б) 6 адзінак першага класа і 250 адзінак другога класа.

4. Даўжыня першага адрэзка 8 см, а даўжыня другога — на 16 см большая. Якую частку даўжыні другога адрэзка складае даўжыня першага адрэзка?

5. Тыгр толькі што паеў. Зараз яго маса 310 кг. Колькі кілаграмаў мяса з'еў тыгр, калі да яды яго маса была 3 ц?

6*. Знайдзі заканамернасць і прадоўжы рад лікаў:

а) 2, 1, 4, 3, 6, 5, ☐, ☐;

б) 15, 16, 14, 17, 13, 18, ☐, ☐;

в) 1, 4, 2, 5, 4, 6, ☐, ☐.

Правообладатель Пачатковая школа

7.

2 дм 8 см * 820 см	5 м * 50 см
9 м 4 см * 9 м 2 дм	5 м * 650 см
6 дм 4 см * 64 см	100 см * 10 дм
91 дм * 9 дм 1 см	20 мм * 2 см

8. Квадрат мае плошчу 9 см^2. Шырыня прамавугольніка такая, як і старана квадрата, а даўжыня ў 3 разы большая. Знайдзі перыметр прамавугольніка.

9. Выканай паслядоўна дзеянні.



10. Для дзіцячага садка купілі 5 скрынь яблыкаў па 24 кг у кожнай. Чацвёртая частка яблыкаў пайшла на кампоты, а астатнія раздалі дзецям на полудзень. Колькі кілаграмаў яблыкаў пайшло на полудзень?

11. Падзялі і правер.

756 : 28	595 : 35	3686 : 97
2646 : 63	3168 : 72	48 984 : 52
1296 : 54	432 : 16	2664 : 36

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 121

Куб

Цыліндр

Шар

Піраміда

Конус

Прызма

1. На якую фігуру падобны: пачак пячэння, аловак, бітон, вядро? Назаві прадметы, якія маюць форму шара, куба, цыліндра, прызмы.

2. На птушкаферме было 3690 курэй. Гэта на 700 больш, чым качак. Гусей было ў 2 разы менш, чым качак. Колькі ўсяго птушак было на ферме?



Правообладатель Пачатковая школа

3. Вылічы.

180 540 : 18	126 840 : 14	125 750 : 25
71 369 : 23	13 120 : 64	5704 : 46

4. Складзі выраз і знайдзі яго значэнне:

а) рознасць ліку 50 498 і здабытку, у якім адзін множнік 18, а другі — сума лікаў 748 і 423;

б) сума, дзе адно складаемае — здабытак лікаў 166 і 59, а другое — дзель лікаў 12 040 і 56;

в) рознасць, у якой памяншаемае — дзель лікаў 9009 і 13, а аднімаемае — дзель лікаў 3740 і 34.

5. Начарці прамавугольнік, шырыня якога роўная $\frac{1}{3}$ ад 12 см, а даўжыня — $\frac{1}{2}$ ад 14 см. Вылічы яго плошчу і перыметр.

6. Рашы ўраўненні.

$x + 287 = 489$	$504 - x = 235$	$x - 488 = 614$
$725 : x = 29$	$x : 11 = 21\,020$	$47 \cdot x = 4700$

7*. Дадзены два аднолькавыя прамавугольныя трохвугольнікі са старанамі 3 см, 4 см і 5 см. Нарысуй, як трэба скласці трохвугольнікі, каб атрымаўся новы трохвугольнік са стараной 8 см. Вылічы перыметр новага трохвугольніка.

8. У Машы і Каці была аднолькавая колькасць грошай. Маша купіла на ўсе грошы 4 каляровыя алоўкі па цане 30 к., а Каця купіла на ўсе грошы простыя алоўкі па цане 20 к. Колькі алоўкаў купіла Каця?

9. Вылічы.

$43 \cdot 29 - 27\,258 : 33$ $\qquad$ $435 : (52 \cdot 7 + 71)$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 122

1. Знайдзі значэнні выразаў.

а) 53 333 – 35 383 : 41 + 997 · 83
б) 347 · 143 : 13 – 3720 + 12 258

2. Ад дзвюх прыстаней, адлегласць паміж якімі 945 км, насустрач адзін аднаму ў 8 г адплылі два цеплаходы, якія сустрэліся ў 23 г таго самага дня. Адзін плыў са скорасцю 28 км/г. З якой скорасцю плыў другі цеплаход?



3. На 1 га пасадзілі 40 000 штук расады капусты. Колькі штук расады трэба, каб пасадзіць капусту на зямельным участку прамавугольнай формы са старанамі 525 м і 100 м?

4*. Знайдзі заканамернасць і запішы, які лік знаходзіцца на дзясятым месцы ў радзе.

а) 1, 2, 4, 8, 16, 32, ...
б) 546, 541, 536, 531, 526, ...

5. Параўнай без вылічэнняў.

42 · 16 : 8 * 42 · 8 : 16
234 · (567 + 8910) * 234 · 567 + 8910
666 · 25 * 222 · 75

Правообладатель Пачатковая школа

6. Запішы выраз, выкарыстаўшы дадзеныя лікі, знакі дзеянняў і дужкі. Знайдзі яго значэнне.

а) Рознасць, у якой памяншаемае запісана здабыткам лікаў 56 і 65, а аднімаемае — сумай лікаў 466 і 2175.

б) Сума лікаў 5867 і дзелі, у якой дзялімае 10 794, а дзельнік — 42.

в) Сума, у якой адно складаемае — здабытак 405 і 62, а другое — рознасць лікаў 24 600 і 5607.

7. Начарці акружнасць з цэнтрам O і радыусам 3 см. Начарці ўнутры акружнасці адрэзак AB, роўны 6 см. Што ты заўважыў? Дзе знаходзяцца пункты A і B? Дзе знаходзіцца пункт O?

8. Ці можа чалавек падняць груз масай 5638 г; 5638 кг; $\frac{1}{10}$ ц? Адказ растлумач.

9. Знайдзі прапушчаныя лікі.

20 км 50 м = ☐ м 4200 мін = ☐ г

90 т 7 ц = ☐ кг 25 сут = ☐ г

10. Палову шляху веласіпедыст праехаў за 2 г са скорасцю 15 км/г, а астатнюю адлегласць — са скорасцю 10 км/г. Колькі часу веласіпедыст быў у дарозе?



11. Вылічы.

6072 : 46 29 982 : 38 455 : 91

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 123

Квадрат

Куб

Круг

Шар

1. Якія прадметы маюць форму:

а) квадрата, куба?

б) круга, шара?

2. З паловы сукна, што было на фабрыцы, пашылі 1827 курток, расходуючы 2 м на кожную. З астатняй тканіны пашылі паліто. На 2 паліто патрэбна столькі ж сукна, колькі на 3 куртк і. Колькі паліто пашылі?



3*. Знайдзі заканамернасць і вылічы, які лік павінен стаяць у гэтым радзе на 11-м месцы.

1, 4, 9, 16, 25, 36, ...

Правообладатель Пачатковая школа

4. Даўжыня ўчастка прамавугольнай формы ў 3 разы большая за шырыню. Шырыня гэтага ўчастка на 120 м меншая за даўжыню. Знайдзі плошчу ўчастка.



5. Якую плошчу мае квадрат са стараной $\frac{1}{2}$ м?

6. Рашы ўраўненні.

$x : 23 = 408$ $x - 72 = 116 \cdot 31$

7. Запішы выраз і знайдзі яго значэнне:

а) здабытак, у якім адзін множнік — рознасць лікаў 5807 і 5744, а другі — сума лікаў 820 і 180;

б) рознасць, у якой памяншаемае 56 709, а адніма-емае выражана дзеллю, у якой дзялімае — 47 475, а дзельнік — 5.

8. Вылічы.

20 мін 36 с + 28 мін 47 с

8 т 3 ц – 47 ц 20 кг

9. З двух гарадоў, адлегласць паміж якімі 960 км, насустрач адзін аднаму ў 8 г раніцы выйшлі два цягнікі. Яны сустрэліся ў 6 г вечара таго самага дня. Знайдзі скорасць першага цягніка, калі скорасць другога — 40 км/г.

10. Вылічы.

24 000 : 50	507 · 33	32 480 : 8
640 · 540	1003 · 682	6410 · 27

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 124

1. Знайдзі значэнні выразаў.

а) 27 971 : 83 · 73 – 5792 + 119 993

б) 250 406 + 72 104 – 43 247 : 59 · 241

в) 5 · (864 – 269) – (2040 – 732)

2. У два магазіны прывезлі яблыкі ў 60 аднолькавых скрынях. У першы магазін адгрузілі 375 кг яблыкаў, а ў другі — 525 кг. Колькі скрынь адгрузілі ў кожны магазін?

	У адной скрыні	Колькасць скрынь	Агульная маса
I	аднолькава	? } 60 шт.	375 кг
II		?	525 кг

3. Начарці адрэзак AB і акружнасці з цэнтрамі ў пунктах A і B так, каб яны перасякаліся. Адзнач пункт, які належыць:

а) толькі акружнасці з цэнтрам A;

б) толькі кругу з цэнтрам B;

в) абедзвюм акружнасцям;

г) абодвум кругам.

4. Параўнай без вылічэнняў.

12 · 10 + 12 · 4 * 12 · 14

25 · 10 + 25 · 7 * 25 · 70

17 · 6 · 10 * 17 · 60

41 · 10 + 41 · 9 * 41 · 90

Правообладатель Пачатковая школа

5. Выразі:

а) у мінутах — 5 г; 3 г 40 мін; 180 с; 3600 с; 720 с;
б) у гадзінах — 6 сут; 3 сут; 180 мін; 240 мін; 36 000 с;
в) у цэнтнерах — 7 т; 4 т 4 ц; 800 кг; 1200 кг; 900 000 г.

6. Ці можа чалавек ісці са скорасцю 360 м/мін; 10 м/с; 4000 м/г; 40 000 м/г, калі скорасць хады складае 5 км/г?

7. Выканай дзеянні.

20 км 640 м − 2 км 949 м
40 т 750 кг − 15 т 897 кг
45 сут − 15 сут 8 г

8*. У шафе было 15 талерак і некалькі шклянак. Калі з шафы ўзялі 7 талерак і 5 шклянак, то талерак засталося на 4 больш, чым шклянак. Колькі шклянак было ў шафе спачатку?



9. За дзень прадалі 640 кг цукру. Да абеду прадалі $\frac{1}{5}$ гэтай колькасці. Колькі кілаграмаў цукру прадалі ў другой палове дня?

10. Вылічы.

1875 : 75 + 602 · 30 402 · 504 − 1729
1598 : 47 + 405 · 40 801 · 45 − 2920

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 125

1. З горада A у горад B адначасова выехалі дзве машыны: першая са скорасцю 50 км/г, а другая са скорасцю 45 км/г. Калі першая машына прыехала ў горад B, другая знаходзілася на адлегласці 25 км ад горада B. Знайдзі адлегласць паміж гарадамі A і B.

2. Фігура 1 выглядае з пунктаў A і B так:





Як выглядае з пунктаў A і B фігура 2? Нарысуй у сшытку па клетачках.

1



2



3. Вылічы.

42 001 – 36 098 – 9891 : 63 + 7899

(254 281 – 6281) : 1000 + 952

Правообладатель Пачатковая школа

4*. Ёсць некалькі парсючкоў аднолькавай масы і некалькі ягнятак таксама аднолькавай масы. Маса трох парсючкоў і двух ягнятак 22 кг, а маса двух парсючкоў і трох ягнятак 23 кг. Знайдзі масу аднаго парсючка і аднаго ягняці.

5. Дадзены трохвугольнік з дзвюма старанамі па 80 мм. Перыметр трохвугольніка 20 см. Начарці акружнасць, радыус якой роўны палове трэцяй стараны трохвугольніка.

6. Запішы найбольшы трохзначны лік і найменшы двухзначны лік. Знайдзі іх суму і павяліч яе ў 3 разы.

7. Першая лінія Мінскага метро была адкрыта 30 чэрвеня 1984 года. У якім стагоддзі гэта адбылося? Колькі поўных гадоў працуе Мінскае метро?

8. Пастаў дужкі, якіх не хапае.

$90 : 3 \cdot 2 + 6 : 2 = 33$

$90 : 3 \cdot 2 + 6 : 2 = 10$

9. Паштовы голуб ляцеў 3 г са скорасцю 23 км/г, а потым знізіў скорасць да 20 км/г. На ўвесь шлях яму спатрэбілася 5 г. Якую адлегласць праляцеў паштовы голуб?

10. Вылічы.

$13\,905 : (937 - 892) + 299$

$4824 : 12 + 37 \cdot 17$

$45 \cdot 24 + 4880 : 16$

Правообладатель Пачатковая школа

Урок 126

1. Перыметр прамавугольніка 112 мм. Адна яго старана ў 3 разы карацейшая за другую. Знайдзі плошчу прамавугольніка.

2. Два веласіпедысты адначасова выехалі насустрач адзін аднаму і праз 3 г сустрэліся. Знайдзі скорасць кожнага, калі вядома, што скорасць першага на 4 км/г большая за скорасць другога, а разам яны праехалі 108 км.



3.

2 км 300 м * 2030 м
8 т 8 ц * 8 т 800 кг
423 см * 43 дм 2 см

8690 м * 8 км 960 м
4 т 60 кг * 4 т 6 ц
63 дм 7 см * 637 см

4. Параўнай з дапамогай цыркуля даўжыні адрэзкаў.



5. Вылічы.

1386 · 8 + 7560 · 5 + 25 675
(1000 – 128 : 2 – 518) · 4
(325 – 107) · (27 · 32 – 812)

Правообладатель Пачатковая школа

6. Выканай дзеянні.

5 кг 160 г + 7 кг 950 г 9 ц 5 кг · 5
1 т 7 ц + 7 ц 7 ц : 25

7. Выканай дзяленне з астачай і зрабі праверку.

185 : 30 667 : 70 480 : 50 800 : 9

8.
Кожная з дзвюх аднолькавых пляцовак для спартыўных гульняў агароджана. Знайдзі даўжыню ўсёй агароджы, калі даўжыня пляцоўкі 24 м, а шырыня ўтрая меншая. Рашы задачу рознымі спосабамі.

9. Знайдзі заканамернасць і прадоўжы рад лікаў.

а) 9, 1, 7, 1, 5, 1, □, □.
б) 1, 3, 9, 27, 81, □, □.

10*. За 5 мін вырабілі 555 цвікоў і шрубаў. За 1 мін цвікоў вырабляюць на 25 больш, чым шрубаў. Колькі шрубаў вырабляюць за 1 мін?

11. Рашы ўраўненні.

$720\,025 - a = 700\,976$ $x + 1925 + 825 = 10\,050$

12. Алеся купіла аднолькавую колькасць сшыткаў і ручак. Цана сшытка 20 к., а цана ручкі 30 к. Колькі сшыткаў і колькі ручак купіла Алеся, калі ўся пакупка каштуе 1 р. 50 к.?

13. Вылічы.

900 − 750 : 3 4805 · 3 − (8189 − 2189)
850 : 5 + 6300 · 4 1605 · 3 + 3874

Правообладатель Пачатковая школа

ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў IV КЛАСЕ

1. Назаві лікі, запісаныя ў табліцы.

Клас тысяч			Клас адзінак		
Сот. тыс.	**Дзяс. тыс.**	**Тыс.**	**Сот.**	**Дзяс.**	**Адз.**
	3	4	8	2	7
5	1	7	2	0	3
	1	0	0	4	9
6	0	7	4	0	0

Колькі ў кожным з гэтых лікаў дзясяткаў тысяч; сотняў; дзясяткаў?

2. Запішы лік, у якім:

а) 52 тысячы і 60 дзясяткаў;
б) 67 сотняў;
в) 5068 дзясяткаў і 4 адзінкі;
г) 4403 сотні.

3. Запішы самы вялікі пяцізначны лік, у якім сума разрадных адзінак:

а) роўная 3;
б) на 3 большая, чым сума разрадных адзінак ліку 88 778;
в) на 15 меншая, чым сума разрадных адзінак ліку 670 589.

Правообладатель Пачатковая школа

4. Запішы найменшы лік, у якім сума разрадных адзінак:

а) роўная 13;

б) на 6 меншая, чым сума разрадных адзінак ліку 105 368.

5. Вылічы.

34 000 + 6200	1700 · 2	8700 : 30
6000 – 20	3500 : 2	260 · 100
999 – 199	480 000 : 20	7500 : 100

6. Бабуля напякла да свята піражкоў. Валя палічыла іх: 30 піражкоў было з мясам, а астатнія — з вішняй. Пасля таго як за абедам з'елі 20 піражкоў з мясам, іх засталося на 7 менш, чым з вішняй. Колькі ўсяго піражкоў напякла бабуля?

7*. Стужку даўжынёй 12 м разрэзалі на аднолькавыя часткі. Колькі атрымалася стужачак, калі адрэзалі 5 разоў? Якая даўжыня кожнай стужачкі?

8. Начарці акружнасць, радыус якой роўны старане квадрата з перыметрам 84 мм.

9. Запішы ў больш буйных адзінках.

18 000 см	34 000 мм	4056 дм
2678 см	100 000 м	27 500 м
6800 дм	8621 мм	60 440 дм

10.

21□□□ * 23□□□

□□412 * □□9□

□□□□ * □□□□□

Правообладатель Пачатковая школа

11. Вылічы рацыянальным спосабам.

$25 \cdot 379 \cdot 4$ $56 \cdot 25 \cdot 9$

$5 \cdot 42 \cdot 2 \cdot 4 \cdot 25$ $125 \cdot 15 \cdot 32$

$4 \cdot 125 \cdot 25 \cdot 8 \cdot 351$ $375 \cdot 32$

12. У трох гадавальніках было 1450 саджанцаў. У першым і ў другім гадавальніках на 20 саджанцаў больш, чым у трэцім. Колькі саджанцаў у кожным гадавальніку?

13. Замяні * лічбамі так, каб рознасць была трохзначным лікам.

* * * * – * = * * *

* * * * – * * = * * *

* * * * – * * * = * * *

14. Вылічы.

$5024 + (16\,021 - 9526) \cdot 13 : 15$

$54\,509 : (67 + 24) - 24 \cdot 15$

$459 \cdot (61 + 3001) - 10\,282 : 97$

15. Даўжыня класнай дошкі 4 м, а шырыня — 1 м 5 дм. Колькі квадратных метраў складае плошча дошкі?

16. З вёскі ў горад на веласіпедзе выехаў паштальён са скорасцю 14 км/г. Адначасова насустрач яму з горада ў вёску выйшаў турыст са скорасцю 8 км/г. Якая адлегласць будзе паміж імі праз паўгадзіны, калі ад вёскі да горада 19 км?

17. Знайдзі два такія лікі, каб іх сума была роўная іх рознасці.

18. Па каларыйнасці 3 кг ячменю замяняюць 4 кг аўса. Колькі кілаграмаў ячменю неабходна, каб замяніць 120 кг аўса?

Правообладатель Пачатковая школа

19. Ваня злавіў трох акунёў. Іх агульная маса 3 кг 150 г. Маса двух акунёў аднолькавая, а маса трэцяга ўдвая меншая за масу любога з іх. Якая маса кожнага акуня?

20. Вызнач колькасць лічбаў у дзелі і вылічы.

57 960 : 46	27 200 : 34	11 ц 7 кг : 27
14 500 : 58	7464 : 24	54 км 801 м : 9

21. Рашы ўраўненні.

$x : 67 = 184$	$14 \cdot x = 3010$
$516 : x = 12$	$22\,042 : x = 214$
$884 : x = 17$	$8118 : x = 18$
$1988 : x = 71$	$x : 83 = 126$

22. Правер дзяленне множаннем.

7248 : 4 = 1812	918 : 34 = 27
319 808 : 152 = 2104	128 384 : 8 = 16 048

23. У час паводкі жыхароў падтопленай вёскі перавозілі на двух катарах: 17-месным і 25-месным. Колькі жыхароў было ў вёсцы, калі кожны катар зрабіў 8 рэйсаў і быў цалкам загружаны? Рашы задачу рознымі спосабамі.

24. Ад горада да прыстані 125 км. А якой гадзіне трэба выехаць з горада матацыклісту, каб паспець на цеплаход, што адыходзіць ад прыстані ў 16 г 30 мін, калі ехаць са скорасцю 50 км/г?

Правообладатель Пачатковая школа

25. Знайдзі значэнні выразаў.

600 320 – 766 · 80 + 54 674 : 2
300 210 – 720 · 70 + 36 483 : 3

26. Параўнай без вылічэнняў.

258 : (2 · 3) * 258 : 2 · 3
145 : 3 · 5 * 145 : 5 · 3
408 : (17 · 8) * 680 : (17 · 8)
656 · 5 – 213 * 657 · 5 – 212

27. На фабрыцы за месяц пашылі 8000 пар абутку. Жаночага абутку пашылі 2880 пар, мужчынскага — у 3 разы менш, а астатні абутак быў дзіцячы. Колькі пар дзіцячага абутку пашылі?

28. Вася прачнуўся ў 7 г 10 мін. На зборы ў школу яму спатрэбілася 45 мін. Колькі часу Вася ішоў у школу, калі ў клас ён увайшоў якраз са званком у 8 г 10 мін?

29. Рашы ўраўненні.

$y + 8965 = 70\,502$ $\qquad$ $50\,044 - a = 8795$
$x \cdot 73 = 2774$ $\qquad$ $c \cdot 85 = 4165$

30. Два цеплаходы адначасова адышлі насустрач адзін аднаму ад дзвюх прыстаней, адлегласць паміж якімі 120 км. Скорасць аднаго цеплахода 18 км/г, а скорасць другога — 22 км/г. Праз колькі гадзін цеплаходы сустрэнуцца?



Правообладатель Пачатковая школа

31. Вылічы.

27 т 495 кг + 9 т 780 кг
19 кг 450 г + 7 кг 80 г
28 м 75 см + 143 м 87 см
5 ц 25 кг + 9 ц 87 кг

32.

7543 см * 75 м 43 см
3600 с * 6 мін
17 т 820 кг * 17 820 кг
8510 ц * 85 т 1 ц
7 стагоддзяў 25 гадоў * 6 стагоддзяў 125 гадоў

33. Адна старана прамавугольніка 6 см. Гэта на 30 мм больш за другую яго старану. Начарці такі прамавугольнік. Вылічы яго перыметр і плошчу.

34. Якія лічбы заменены зорачкамі?

$$\begin{array}{r} 4*46 \\ +\ 38*7 \\ \hline 806* \\ \hline **308 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 35398 \\ +\ **456 \\ \hline 17*** \\ \hline 100000 \end{array}$$

35. На тры склады даставілі груз. На першы і другі склады разам завезлі 400 т грузу, на другі і трэці — 300 т, на першы і трэці — 400 т. Колькі тон грузу даставілі на кожны склад?

36. Вылічы.

(1790 – 530) : (34 – 29) + (10 987 – 9917)
(280 030 : 41 – 48 639 : 93) · 3
143 620 : 43 + 247 445 : 55

Правообладатель Пачатковая школа

37. Вылічы.

37 924 : 4 + 8688 : 12
(1 000 000 − 936 · 180) : 20
964 · 17 − 104 858 : 26
839 · (4 · 12 + 96 : 24)
3708 : 36 · (129 317 − 128 939)

38. Запішы выраз і знайдзі яго значэнне:

а) сума, у якой першае складаемае запісана здабыткам лікаў 456 і 12, а другое — дзеллю лікаў 9545 і 23;
б) рознасць, у якой памяншаемае запісана дзеллю лікаў 23 598 і 69, а аднімаемае — найбольшы двухзначны лік;
в) дзель, у якой дзялімае запісана здабыткам лікаў 140 і 141, а дзельнік — лік 35.

39. Даўжыня прамавугольніка 120 дм. Яна большая за шырыню на 60 дм. Знайдзі перыметр і плошчу гэтага прамавугольніка.

40. Дзве машыны перавозілі 7952 ц грузу. Штодзень машыны перавозілі аднолькавую колькасць грузу. Колькі цэнтнераў грузу перавозіла кожная машына, калі першая працавала 7 дзён, а другая — 9 дзён?

41. Плошча прамавугольніка 120 см^2, яго шырыня 10 см. Шырыню паменшылі ў 2 разы, а даўжыню павялічылі ў 6 разоў. У колькі разоў павялічылася плошча прамавугольніка?

Правообладатель Пачатковая школа

42. У дзве пякарні прывезлі 250 аднолькавых мяхоў мукі. Адна пякарня атрымала 10 125 кг мукі, а другая — на 1500 кг мукі менш. Колькі мяхоў мукі атрымала кожная пякарня?

43. Знайдзі значэнні выразаў.

5 т 2 ц 29 кг · 4 – 14 т 98 кг : 38
3 сут 18 г – 2 сут 5 г + 7 сут 19 г

44.

$(156 \cdot 3) \cdot 2 * (156 \cdot 2) \cdot 3$
$67 \cdot 4 \cdot 3 * (67 \cdot 3) \cdot 4$
$6 \cdot (3 \cdot 58) * 58 \cdot (3 \cdot 6)$
$(115 \cdot 2) \cdot 3 * 115 \cdot (2 + 3)$

45. У чорным крузе знаходзяцца лікі, якія дзеляцца на 7, а ў сінім — лікі, якія дзеляцца на 5. Якія лікі знаходзяцца ў чорным крузе, але па-за сінім кругам? У сінім крузе, але па-за чорным кругам? Адначасова ў сінім і чорным кругах? Па-за абодвума кругамі?



46. Запішы ў больш буйных адзінках.

60 000 ц	300 800 кг	560 698 кг
400 000 кг	7680 ц	3843 ц
18 000 г	300 500 г	1 000 000 г

Правообладатель Пачатковая школа

47. Запішы выраз і знайдзі яго значэнне:

а) здабытак лікаў 25 і 48 паменшылі на 15;
б) 5707 павялічылі на дзель лікаў 34 062 і 42;
в) найбольшы трохзначны лік паменшылі на дзель лікаў 99 і 9;
г) здабытак лікаў 3806 і 5 павялічылі на іх суму.

48. Калі адну старану прамавугольніка, даўжыня якой 9 см, павялічыць на 3 см, то яго плошча павялічыцца на 18 см^2. Якая была першапачатковая плошча прамавугольніка?

49. Адлегласць паміж двума пасёлкамі 48 км. З аднаго пасёлка ў другі выехаў чалавек на кані. Конь рухаўся са скорасцю 12 км/г. Назад яны вярталіся з паклажай са скорасцю 6 км/г. Колькі ўсяго часу ехаў чалавек?



50. Вылічы.

25 · (28 · 105 + 7254 : 18)
22 274 : 37 + 602 · 12
(4267 − 1843) : 6 · 25
76 · 125 − 72 405 : 45

Правообладатель Пачатковая школа

51. Даўжыня агарода прамавугольнай формы 72 м, а яго шырыня ў 2 разы меншая. $\frac{1}{4}$ плошчы агарода занята гароднінай, а астатняя частка — бульбай. Якая плошча занята бульбай?

52. З паперы зрабілі рамку са старанамі 40 см і 35 см. Шырыня самой рамкі 5 см. Знайдзі плошчу рамкі.



53. Самыя вялікія азёры Беларусі — Нарач і Асвейскае. Плошча возера Нарач 7960 га, а плошча Асвейскага возера на 2660 га меншая. Знайдзі плошчу Асвейскага возера.

54. Запішы ўраўненне і рашы яго:

а) калі да ліку дадаць 43 509, то атрымаецца 63 478;
б) калі лік павялічыць у 5 разоў, то атрымаецца 15 065;
в) калі лік павялічыць у 7 разоў, то атрымаецца 196.

55. Знайдзі значэнні выразаў:

а) $18\,655 - x : 27$, калі $x = 8127; 8397; 8532$;
б) $x \cdot 48 + 350\,094$, калі $x = 125; 3125$;
в) $14\,976 : a$, калі $a = 18; 26; 72$.

56. Дзіму спыталі: «Колькі табе гадоў?» Ён адказаў: «Калі колькасць маіх гадоў павялічыць у 4 разы, затым паменшыць на 16, то будзе 20 гадоў». Колькі гадоў Дзіме?

57. Рашы ўраўненні.

$x : 780 = 12$
$x - 264 = 1080$
$16 \cdot x = 4309 - 965$
$312 \cdot 26 - x = 235$
$x + 62 \cdot 26 = 19\,344$
$312 = x + 312$

Правообладатель Пачатковая школа

58. Адзін спартсмен бяжыць са скорасцю 8 м/с і даганяе другога спартсмена, скорасць якога 6 м/с. Праз які час адзін спартсмен абгоніць другога, калі зараз адставанне складае 10 м?



59. Як зменіцца значэнне здабытку, калі:

а) адзін множнік павялічыць у 4 разы, а другі павялічыць у 2 разы;

б) адзін множнік павялічыць у 6 разоў, а другі паменшыць у 12 разоў?

60. Якія лічбы заменены зорачкамі?

$$\begin{array}{r} 6*767 \\ +\ 356*3 \\ \hline **0*1* \end{array} \qquad \begin{array}{r} 3*63* \\ -\ *25*6 \\ \hline 1*54 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 7**57 \\ -\ *817* \\ \hline 18*9 \end{array}$$

61*. У двух кошыках аднолькавая колькасць грыбоў. Калі ў абодва кошыкі расклалі яшчэ 35 грыбоў, то ў першым стала 40 грыбоў, а ў другім — 25 грыбоў. Колькі грыбоў было ў кожным кошыку спачатку?



Правообладатель Пачатковая школа

62. Адзнач пункты A, B, C і D у сшытку. Злучы адрэзкамі пункт A з B, B з C, C з D, D з A. Якая фігура атрымалася? Злучы адрэзкамі пункты A і C, B і D. Якія каардынаты пункта перасячэння гэтых адрэзкаў?



63. Запішы ў больш буйных адзінках часу.

420 с	408 г	760 г
560 мін	2700 с	600 с
1080 с	36 000 мін	100 000 гадоў

64. Пры ўзворванні 1 га поля пераварочваецца каля 3000 т зямлі. Колькі тон зямлі пераварочваецца пры ўзворванні ўчастка прамавугольнай формы са старанамі 100 м і 500 м?

65. Параўнай без вылічэнняў.

$936 : (12 \cdot 13) * 936 : 12 \cdot 13$

$345 \cdot 23 : 15 * 345 : 15 \cdot 23$

$731 : 17 \cdot 8 * 952 : 17 \cdot 8$

$812 \cdot 5 + 213 * 812 \cdot (5 + 213)$

Правообладатель Пачатковая школа

66. У 9 г раніцы веласіпедыст выехаў на шашу і ўбачыў на кіламетровым слупе адзнаку з лікам 297. У 12 г ён спыніўся каля слупа з адзнакай 339. За колькі гадзін ён праедзе астатні шлях да адзнакі 367 км, калі будзе ехаць з такой самай скорасцю?



67. Як зменіцца значэнне дзелі, калі:

а) дзялімае павялічыць у 8 разоў, а дзельнік паменшыць у 4 разы?

б) і дзялімае, і дзельнік паменшыць у 4 разы?

в) і дзялімае, і дзельнік павялічыць у 4 разы?

68. Начарці квадрат з перыметрам 16 см. Дапоўні яго да прамавугольніка з перыметрам 20 см. Знайдзі стораны прамавугольніка.

69. Складзі ўраўненне па рысунку і знайдзі масу аднаго кавуна.



70. Пастаў дужкі так, каб роўнасці былі правільныя.

42 + 72 : 2 · 3 = 54 42 + 72 : 2 · 3 = 150

42 + 72 : 2 · 3 = 171 42 + 72 : 2 · 3 = 19

Правообладатель Пачатковая школа

71. Адлегласць ад дома да школы 1 км 200 м. Па дарозе ў школу Алег прайшоў 1 км за $\frac{1}{3}$ г. На астатні шлях у яго засталося 7 мін. Ці паспее хлопчык на першы ўрок, калі будзе ісці з той жа скорасцю?



72. Запішы выраз і знайдзі яго значэнне:

а) рознасць, у якой памяншаемае — здабытак лікаў 387 і 86, а аднімаемае — дзель лікаў 50 758 і 82;

б) здабытак, у якім першы множнік — дзель лікаў 45 210 і 66, а другі — рознасць лікаў 40 034 і 39 986;

в) сума, у якой адно складаемае — 74 830, а другое — здабытак лікаў 3650 і 56.

73*. Адзін трактарыст узараў $\frac{1}{5}$ поля, а другі — $\frac{2}{5}$ таго ж поля. Якую частку поля засталося ўзараць?

74. Начарці два адрэзкі так, каб даўжыня аднаго адрэзка складала чвэрць даўжыні другога.

75. Вылічы.

2592 : 36 + (4265 – 2843) : 6

(5267 – 2843) · (72 405 : 45 + 391)

(5987 – 2695) · (4 · 15 + 100 : 25)

Правообладатель Пачатковая школа

76. Страус — адна з самых вялікіх птушак, а самая маленькая — калібры. Страус важыць 136 кг, а калібры — 2 г. У колькі разоў калібры лягчэйшая за страуса?

77. Цягнік выйшаў з Мінска 12 ліпеня ў 9 г 10 мін і прыбыў у Саратаў 13 ліпеня ў 15 г 43 мін. Колькі часу цягнік быў у дарозе ад Мінска да Саратава?

78. Якія лічбы заменены зорачкамі?

$$\begin{array}{r} *5* \\ \times\ \ *8 \\ \hline 2*64 \\ +\ 1*3* \\ \hline *718* \end{array} \qquad \begin{array}{r} 2* \\ \times\ 56 \\ \hline 1*8 \\ +\ **5 \\ \hline **** \end{array} \qquad \begin{array}{r} ** \\ \times\ \ *3 \\ \hline *22 \\ +\ 1** \\ \hline **0* \end{array}$$

79. Як зменіцца значэнне сумы, калі:

а) адно складаемае паменшыць на 140, а другое паменшыць на 130?

б) адно складаемае павялічыць на 55, а другое павялічыць на 50?

80. Калі са сховішча для гародніны ўзялі 3230 кг бульбы, то там засталося на 2120 кг бульбы больш, чым узялі. Колькі кілаграмаў бульбы было ў сховішчы спачатку?

Правообладатель Пачатковая школа

81. Зернеачышчальная машына павінна была згодна з планам ачысціць за 24 дні 7680 т зерня, а ачысціла на 1680 т больш. Колькі зерня за дзень ачышчала машына?

82.

56 т 6 ц * 560 ц 80 кг
180 ц 4 кг * 1860 кг
57 кг 80 г * 5800 г

83*. Коля і Саша адначасова выйшлі насустрач адзін аднаму з аднолькавай скорасцю — 80 м/мін. Адлегласць паміж імі складала 960 м. У Сашы быў сабака, які бег у 4 разы хутчэй, чым ішоў хлопчык. Сабака ўвесь час бегаў ад аднаго хлопчыка да другога. Колькі метраў прабег сабака, пакуль дзеці сустрэліся?



84. Пастаў патрэбныя знакі дзеянняў і дужкі.

5000 * 1800 * 8 = 400
6000 * 1200 * 6 = 1200
6000 * 1500 * 5 = 900
7000 * 1400 * 3 = 2800

85. Прамавугольная вітрына мае плошчу 24 м^2. Яе даўжыня 6 м. Знайдзі вышыню вітрыны.

Правообладатель Пачатковая школа

86. Рознасць двух лікаў роўная 63 517. Якой атрымалася б рознасць, калі б у памяншаемым лічбу 3 у разрадзе тысяч замянілі лічбай 6, у аднімаемым лічбу 6 у разрадзе сотняў замянілі лічбай 8, а лічбу 8 у разрадзе дзясяткаў замянілі лічбай 3?

87. Аднаві прыклады.

а)
```
_****|4
 **  |723
 ---
  _*
   *
   ---
  _**
   **
   ---
    0
```

б)
```
_4920|*
 **  |615
 ---
 _*2
   *
   ---
  _*0
   **
   ---
    0
```

в)
```
_**48|*
 *   |11**
 ---
 _*
  6
  ---
  _48
   **
   ---
    0
```

г)
```
_*5*|2
 4  |**6
 ---
 _15
  1*
  ---
  _1*
   **
   ---
    0
```


Правообладатель Пачатковая школа

ВУЧЫСЯ РАЗВАЖАЦЬ ПРАВІЛЬНА

1. Прывядзём прыклад правільнага разважання, якое складаецца з трох сказаў.

1. Калі лік заканчваецца лічбай 5, то ён дзеліцца на 5.
2. Лік 2665 заканчваецца лічбай 5.
3. Значыць, лік 2665 дзеліцца на 5.

Сказы 1 і 2 называюцца **пасылкамі**, а сказ 3 — **заключэннем**.

Назаві пасылкі і заключэнне ў разважанні.

а) 1. Калі лік заканчваецца лічбай 6, то ён дзеліцца на 2.
2. Лік 53 016 заканчваецца лічбай 6.
3. Значыць, лік 53 016 дзеліцца на 2.

б) 1. Калі ў чатырохвугольніку ўсе вуглы прамыя, то ён з'яўляецца прамавугольнікам.
2. У квадрата ўсе вуглы прамыя.
3. Значыць, квадрат з'яўляецца прамавугольнікам.

2. Выкарыстоўваючы дадзеныя пасылкі, прыдумай заключэнне.

а) 1. Калі жывёла харчуецца мясам, то яна драпежнік.
2. Воўк харчуецца мясам.
3. Значыць, … .

б) 1. Калі да ліку справа прыпісаць 0, то лік павялічыцца ў 10 разоў.
2. Да ліку 23 справа прыпісалі 0.
3. Значыць, … .

Правообладатель Пачатковая школа

3. Для дадзеных пасылкі і заключэння прыдумай пасылку, якой нестае.

а) 1. Калі вада ў чайніку закіпела, то яе тэмпература 100 градусаў.
2. ...
3. Значыць, тэмпература вады ў чайніку 100 градусаў.

б) 1. Калі паветраны шарык надзьмуць гарачым паветрам, то ён падымецца.
2. ...
3. Значыць, Сярожаў шарык падымецца.

4. Знайдзі заканамернасць у разважаннях *а* і *б*. Назаві пасылкі і заключэнне ў гэтых разважаннях.

а) 1. Калі лік дзеліцца на 9, то сума лічбаў гэтага ліку дзеліцца на 9.
2. Сума лічбаў ліку 74 (7 + 4 = 11) не дзеліцца на 9.
3. Значыць, лік 74 не дзеліцца на 9.

б) 1. Калі лік дзеліцца на 3, то сума лічбаў гэтага ліку дзеліцца на 3.
2. Сума лічбаў ліку 82 (8 + 2 = 10) не дзеліцца на 3.
3. Значыць, лік 82 не дзеліцца на 3.

5. Зрабі заключэнне ў разважанні.

а) 1. Калі прамавугольнік — квадрат, то ў яго ўсе стораны роўныя.
2. У прамавугольніка $MKOT$ не ўсе стораны роўныя.
3. Значыць, ...



Правообладатель Пачатковая школа

б) 1. Двухзначны лік, запісаны аднолькавымі лічбамі, дзеліцца на 11.
2. Двухзначны лік m не дзеліцца на 11.
3. Значыць, … .

6. Прааналізуй разважанне *а*. Закончы разважанні *б*, *в*, *г*.

а) 1. У канверце ляжыць квадрат або круг.
2. Няпраўда, што ў канверце ляжыць квадрат.
3. Значыць, у канверце ляжыць круг.

б) 1. Нарысавана фігура: вострый або тупы вугал.
2. Гэты вугал не тупы.
3. Значыць, … .

в) 1. На дошцы запісаны двухзначныя і трохзначныя лікі.
2. Запісаны лік n не трохзначны.
3. Значыць, … .

г) 1. Прыклад на адніманне можна праверыць з дапамогай складання або аднімання.
2. …
3. Значыць, Таня праверыла рашэнне прыкладу на адніманне складаннем.

7. Завяршы разважанні.

а) 1. Калі лік большы за 999, то ён большы за 900.
2. Калі лік большы за 900, то ён большы за 100.
3. Значыць, … .

б) 1. Тупы вугал большы за прамы.
2. Прамы вугал большы за вострый.
3. Значыць, … .

Правообладатель Пачатковая школа

8. Завяршы разважанні.

а) 1. У школьнай алімпіядзе па матэматыцы прымаюць удзел вучні, якія маюць добрыя адзнакі па матэматыцы.
2. Надзя і Алесь удзельнічаюць у школьнай алімпіядзе па матэматыцы.
3. Значыць, … .

б) 1. У класе Таня сядзіць побач з Аленай. На ўроках англійскай мовы яна сядзіць побач з Сяргеем.
2. Зараз урок англійскай мовы.
3. Значыць, … .

в) 1. Людзі, якія прытрымліваюцца здаровага ладу жыцця, займаюцца спортам і правільна харчуюцца.
2. Дзяніс і Віка прытрымліваюцца здаровага ладу жыцця.
3. Значыць, … .

9. Ёсць правільныя разважанні, якія маюць толькі адну пасылку і заключэнне.

У наступных разважаннях устанаві заканамернасці іх утварэння. Закончы разважанне *б*.

а) 1. Дуб, клён, бяроза, елка, сасна, асіна — дрэвы.
2. Значыць, бяроза — дрэва.

б) 1. Трактар, камбайн, грузавік, аўтобус — машыны.
2. Значыць, … .

Правообладатель Пачатковая школа

Вучэбнае выданне

ЧАБАТАРЭЎСКАЯ Тамара Мацвееўна
НІКАЛАЕВА Валянціна Уладзіміраўна

МАТЭМАТЫКА

Вучэбны дапаможнік для 4 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках
Частка 2

2-е выданне, выпраўленае і дапоўненае

Рэдактар *І. А. Стральчук*
Мастакі *У. А. Малахаў, В. В. Арлова*
Вёрстка *В. В. Арловай, А. А. Ракавай*
Карэктар *Т. В. Басалыга*

Падпісана да друку 05.10.2018. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 10,5 + 0,29 форз. Ул.-выд. арк. 4,6 + 0,4 форз. Тыраж 9110 экз. Заказ 1697.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Пачатковая школа”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/50 ад 08.10.2013.
Вул. Фабрыцыуса, 5, каб. 201, 220007, г. Мінск. Тэл. 285-37-44. Тэл./факс 233-99-34.
www.pshop.by; www.p-shkola.by; e-mail: psh@p-shkola.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.

Правообладатель Пачатковая школа

(Назва і нумар установы адукацыі)

Навучальны год	Імя і прозвішча вучня	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			

Правообладатель Пачатковая школа

Множанне многазначных лікаў

	Дзяс. тыс.	Тыс.	Сот.	Дзяс.	Адз.
		3	2	1	3
×				2	3
		9	6	3	9
+	6	4	2	6	
	7	3	8	9	9







Дзяленне многазначных лікаў

Тыс.	Сот.	Дзяс.	Адз.
_1	9	2	6
1	8	↓	
	1	2	
		_12	
		0	
		12	6
			_126
			126
			0

: 18 = 107